Москва, Б-ка ЦСК СССР
19.дек. Экз.-1

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ—XIV
№ 295 (3893)
ПЯТНІЦА, 19 СЬНЕЖНЯ
1930 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем чацьвярга

Пералому ў ільназагатоўках няма!

Пасьля раду вычарпальных дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК, пасылкі звыш 100 адказных работнікаў з цэнтру на месцы можна было чакаць рашучага пералому ў ільназагатоўках ужо ў першую пяцідзёнку сьнежня. Аднак, прайшлі ўжо тры пяцідзёнкі сьнежня месяца, а пералому няма. Плян на 15-е сьнежня выкананы па ільнавалакне ўсяго на 9,5 проц., па ільнасемі — на 41,77 проц.

Прычыны такога дрэннага выкананьня пляну да гэтага часу ў асноўным зьводзяцца ў недаацэнцы важнасьці ільназагатовак, у стаўцы на самацёк, у апартуністычным «благодушіи» і чаканьні, што нават кулацка-заможныя элементы вёскі без асаблівага націску аддадуць свае пішкі ільнавалакна і ільнасемя пралетарскай дзяржаве.

Спадзяючыся на самацёк і не жадаючы сварыцца з кулаком, апартуністы раду раёнаў правялі выкананьне пастановы партыі і ўраду аб зборы ільнавалакна і семя па цьвёрдых заданьнях поўнасьцю да 10-га сьнежня. Весткі з месц гавораць, што ня ўсюды яшчэ нават да гэтага тэрміну былі даны цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнай частцы вёскі. Гэты ганебны факт нельга характарызаваць, як патураньне кулаку. Амаль усюды адсутнічае ўлік цьвёрдых заданьняў, даных кулаку, зусім адсутнічае ўлік іх выкананьня.

Нават такія буйныя ільнаводныя раёны, як ГАРАДОЦКІ, СІРОЦЯНСКІ ня маюць гэтага ўліку, што выразна гаворыць аб проста апартуністычнай недаацэнцы важнасьці гэтага пытаньня і аб недапушчальным ігнараваньні дырэктыў кіруючых партыйных і ўрадавых органаў.

Колгасы яшчэ не ўзяліся па-баявому за выкананьне пляну ільназагатовак па сваёй лініі. Так, на 10-га сьнежня імі было здана ільнаканапляводчай кааперацыі толькі 6,5 проц. іх заданьня па ільнавалакне.

Асноўная прычына слабай здачы ільнавалакна калгасамі заключаецца ў НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ ХОДЗЕ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ ПА КАЛГАСНЫМ СЭКТАРЫ. Рад калгасаў да гэтага часу яшчэ не прыступілі для першапачатковай апрацоўкі. Толькі ў нязначнай колькасьці калектывах арганізаваны брыгады калгасьнікаў для выкананьня гэтай работы.

Наглядаюцца зусім недапушчальныя выпадкі агідных адносін да справы ільнаводзтва як сярод асобных калгасаў, так і некаторых кіраўнікоў. Яркім прыкладам можа служыць калгас «КАМСАМОЛЕЦ» (ГАРАДОЦКІ раён), дзе значная частка ільну загінула на полі, дый убраны лён да гэтага часу не апрацоўвецца. Ва ўслянім выпадку, выніні работы калгасаў па апрацоўцы і здачы ільну нездавальняючыя. Адстаючыя калгасы павінны неадкладна падцягнуцца, каб своечасова выканаць сваё заданьне.

Трэба адначасова адзначыць, што якасьць ільнавалакна ў сярэднім на 1-2 нумары ніжэй петаўняй якасьці. Гэта рэзультат, галоўным чынам, невысокакачэственнай апрацоўкі ільну. Ёсьць рад выпадкаў, калі пасобныя здатчыкі ільну надзвычай няўважліва адносяцца да яго апрацоўкі, толькі-б хутчэй выканаць свой «абавязак». Што датычыць кулацка-заможных элемэнтаў, дык яны, выконваючы цьвёрдыя заданьні, наўмысьля імкнуцца здаць лён дрэннай якасьці.

Ня гледзячы на рад указаньняў Наркамгандлю і інш. арганізацый, на мясцох не дасцца належнага адпору гэтым імкненьням кулацка-заможных элемэнтаў і нават, наадварот, наглядаюцца выпадкі садзейнічаньня гэтаму зьявішчу. У пагоні за колькасным выкананьнем пляну, загатоўшчыкі зусім выпускаюць з-пад увагі асноўнае, г. зн. якасьць валакна.

ТРЭБА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО СЫСТЭМА ІЛЬНАКАНАПЛЯВОДЧАЙ КААПЭРАЦЫІ ТАКСАМА НЕ ДАЛА ПЕРАЛОМУ Ў БОК ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ЗАГАТОВАК. Наадварот, ёсьць рад выпадкаў, якія гавораць аб надзвычай ненармальных і нават злачынных адносінах да загатовак. У прыватнасьці, плян загатовак ільнасемя выкананы ільнаканапляводчай сыстэмай на 10 сьнежня ўсяго на 33,8 проц., а пасеўнага ільнасемя нават толькі на 13,3 проц. Пры аднолькавым пляне і пры аднолькавых умовах загатоўчай работы ЛЁЗЬНЕНСКІ райкаапсаюз, напрыклад, выканаў заданьне па ільнасемі на 46 проц. у той час, як СУРАСКІ райкаапсаюз — толькі на 28,5 проц. Або амаль пры аднолькавых умовах ЧАШНІЦКІ райкаапсаюз даў 85 проц. выкананьня пляну ў той час, як ЛЯДНЯНСКІ — 18 проц., а РАСОНСКІ — усяго падзь 16,7 проц. (па ільнасемі). Як зусім недапушчальна-злачынныя адносіны да загатоўкі ільнасемя трэба адзначыць дзейнасьць КАЛІНКАВІЦКАГА І СТАРОБІНСКАГА райкаапсаюзаў, якія з самага пачатку загатоўчай кампаніі яшчэ нават не палічылі патрэбным даць справаздачу аб сваёй рабоце. Гэты факт сыгналізуе тое, што даныя райкаапсаюзы да загатоўкі ільнасемя зусім не прыступалі і такім чынам плянаў ня выконваюць. У адносінах да гэтых раёнаў трэба неадкладна прыняць адпаведныя жорсткія меры.

Па раёнах вядучых напрамкаў у галіне загатоўкі ільнавалакна, ільнаканапляводчай кааперацыі мы маем такі малюнак. Райкаапсаюзы ільнаводчых раёнаў свой плян выканалі на 10 сьнежня на 10 проц., жывёлагадоўчых раёнаў — на 5,5 проц., а садова-гародных — толькі на 1,5 проц. ГОМЕЛЬСКІ І ЛУПАЛАЎСКІ райкаапсаюзы (садова-гародныя) нават зусім не прыступалі да загатоўкі ільнавалакна і збору закантрактаванай у калгасах і ў адзіначасобнікаў прадукцыі.

Такія буйныя ільнаводчыя раёны, як ПОЛАЦКІ, АРШАНСКІ І ВІЦЕБСКІ, выканалі плянавыя заданьні па валакне ад дзьвёх да адной сотай процанту і ні аднаго цэнтнэра не сабралі калгаснага і закантрактаванага ільну. ВІЦЕБСКІ РАЙКААПСАЮЗ ЗАКРЫЎ НАВАТ ЗАГАТОЎЧЫ ПУНКТ НА ПОЛАЦКІМ РЫНКУ. А СПЭЦЫЯЛІСТА ПА ІЛЬНАВАЛАКНЕ І СЕМІ ПАСТАВІЎ НА ЗАГАТОЎКУ ГАРОДНІНЫ. Такія злачынныя дзеяньні праў раёнаў ня толькі зрываюць ільназагатоўкі, але і плян мабілізацыі сродкаў, бо не спаганяюцца выданыя па кантрактацыі авансы.

Урадавая чацьвёрка яшчэ ў канцы лістапада канстатавала, што ўлік загатоўленай прадукцыі пастаўлен далёка нездавальняюча, і абавязала загатоўчыя арганізацыі і РВК наладзіць гэту справу з тым, каб своечасова пасылаліся 5-дзенныя зводкі. Ня гледзячы на гэта, на 10 сьнежня 39 раёнаў не далі зводак аб ходзе загатовак, у тым ліку і ільнаводныя — Лёзненскі і Лядняскі раёны. Гэта не дае магчымасьці, ня толькі весьці дакладны ўлік загатоўленай прадукцыі, але і мяркаваць аб сапраўдным стане рэчаў.

Збор закантрактаванага ільнавалакна і па індывідуальным сэктары праходзіць далёка нездавальняюча. На 10-XII яго трэба было сабрасць ня менш 50 проц. Сабрана-ж усяго 16,6 проц., прычым, як ужо адзначалася, рад раёнаў у гэтым напрамку ніякай работы не вядзе. Да сёнешняга дня, ня гледзячы на рад указаньняў Белканапляводсаюзу, злосныя нездатчыкі закантрактаваной прадукцыі ня прыцягнуты да адказнасьці, а там, дзе і прыцягнуты, справы ляжаць у судовых органах бяз усякага руху. Судовыя органы неадкладна павінны ўключыцца ў кампанію па зборы закантрактаванай прадукцыі.

Трэба адзначыць, што асабліва дрэнна праходзіць загатоўка канапель, па якой плян на 10 сьнежня выкананы менш, чым на 1 проц.

Плян загатовак канапель (семя) выкананы на 10,8 проц. Калі бліжэйшыя дні не дадуць у гэтым напрамку рашучага пералому, дык мы станем перад пагрозай канчатковага провалу загатовак канапель. Улічваючы, што ўся колькасьць канапель, якая загатаўляецца, пакідаецца выключна для пасеўных мэт, раённыя арганізацыі павінны з асаблівай энэргіяй узяцца за выкананьне пляну загатовак канапель, бо ў запежнасьці ад мясцовай загатоўкі насеньня гэтай культуры стаіць пытаньне аб выкананьні пляну сяўбы канапель у 1931 годзе.

Адзначаныя прарывы, як мы вышэй паказвалі, зьяўляюцца ў асноўным рэзультатам праваапартуністычнай практыкі: стаўкі на самацёк, бязьдзейнасьці, «благодушія», а часта простага патураньня кулаку. Неабходна ўзмацніць барацьбу з праваапартуністычнай практыкай і яе канкрэтнымі носьбітамі, каб у бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому і ў першую чаргу прымусіць кулацка-заможную частку вёскі выканаць цьвёрдыя заданьні.

Злосныя нездатчыкі закантрактаванай прадукцыі павінны быць неадкладна прыцягнуты да судовай адказнасьці з выцякаючымі адсюль жорсткімі вынікамі, згодна заключаных дагавораў. Судовым органам трэба гэтыя справы разглядаць без затрыманьня, у тэрміновым парадку.

Калгасы павінны рашуча падцягнуцца з апрацоўкай і свячасовай здачай сырцу, стаць сапраўдным узорам для наўкольнага насельніцтва і ў гэтых адносінах.

Змагаючыся за высокія тэмпы загатовак, трэба весьці сур'ёзную барацьбу за якасьць ільнавалакна, абавязваючы кулацка-заможныя гаспадаркі і кантрактантаў здаваць сваю прадукцыю ў добра апрацаваным выглядзе.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на пытаньні загатоўкі насеннага матар'ялу ільнасемя і канапель, маючы на ўвазе, што ад вынікаў загатовак гэтых культур у значнай ступені залежыць выкананьне пляну веснавой сяўбы.

Трэба рашуча пакласьці канец няўважлівым і напляваецельскім адносінам да ўліку прадукцыі, якая загатаўляецца, бо бяз ўліку праробленай работы нельга своечасова выпраўляць дапушчаныя памылкі.

Раённыя, партыйныя і савецкія арганізацыі, вядучы жорсткае змаганьне з праваапартуністычнай практыкай у галіне ільназагатовак, павінны стаць на чале ільназагатоўчай кампаніі і ўзяць пад свой кантроль усю загатоўчую работу, у тым ліку і выкананьне кантрактантамі сваіх абавязкаў, ні ў якім выпадку, аднак, на практыцы не падмяняючы загатоўчых арганізацый, што ў некаторых мясцох мела месца.

Пляны ільназагатовак павінны і будуць выкананы і перавыкананы савецкая сацыялістычная індустрыя атрымае савецкі сырэц.

У атаку за лён

КУЛАК НЯ ВЫКАНАЎ У ТЭРМІН ЗАДАНЬНЯЎ

9,5 проц. ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ПА ВАЛАКНЕ—ГЭТА ВЫНІК ПРАВА-АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ, НЕВЫСТАРЧАЛЬНАГА НАЦІСКУ НА КУЛАКА, СТАЎКІ НА САМАЦЁК І ЗЛАЧЫННАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ

Партарганізацыі павінны бязьлітасна біць па канкрэтных косьбітах праваапартуністычнай практыкі, якія патураюць кулаку

Трывожныя лічбы

Трэцяя пяцідзёнка сьнежня фактычна не дала ніякага зруху ў выкананьні пляну загатовак тэхкультур.

На 15 сьнежня плян загатовак ільнавалакна выкананы толькі на 9,5 проц.; ільнасемя—на 41,7 проц. На 10 сьнежня было выкананна па валакне—7 проц. па семі 31,9 проц. Асабліва дрэнна праходзіць загатоўка пяньні—плян выкананы на 2,4 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду месцы да гэтага часу яшчэ не павярнуліся тварам да ільназагатовак.

У радзе раёнаў пляны загатовак і зараз не даведзены да калгасаў, вёсак, а кулацка-заможным гаспадаркам не даны цьвёрдыя заданьні.

Усё яшчэ ня зьнішчаны непаладкі ў забесьпячэньні раёнаў прамтаварамі і алеем.

Шырокая грамадзкасьць, вясковы актыў, калгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы далёка ня ўсюды ўцягнуты ў барацьбу за выкананьне пляну загатовак ільну.

Прамысловасьць чакае сырцу. Выкананьне прамфінпляну тэкстыльных фабрык залежыць ад свячасовага і поўнага выкананьня пляну загатовак ільну.

Партыйныя арганізацыі павінны неадкладна дабіцца рашучага пералому ў справе загатовак ільну, мабілізуючы масы на барацьбу з кулаком, на выкананьне пляну, змагаючыся з апартуністычнымі настроямі асобных арганізацый і работнікаў.

ДРЫСЕНШЧЫНА ВЫСУНУЛА СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН

ДРЫСА. (На шкар.). Паводле пляну Наркамгандлю, Дрысенскі раён павінен загатовіць 480 тон ільнавалакна і столькі-ж ільняного семя. РАЁНАМ ВЫСУНУТЫ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН, ЯКІ ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ЗАГАТОЎКУ 550 ТОН ІЛЬНАВАЛАКНА І 557 ТОН ІЛЬНЯНОГА СЕМЯ.

Пляны даведзены да с-саветаў, вёсак, паселішчаў і калгасаў. Цьвёрдыя заданьні прад'яўлены 162 кулацка-заможным гаспадаркам.

Ільназагатоўкі пастаўлены ў цэнтр усёй работы партарганізацыі.

У ВЫНІКУ РАЗГОРНУТАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ МЕСЦАМІ ВЫСУНУТЫ СУСТРЭЧНЫЯ ТЭРМІНЫ СКАНЧЭНЬНЯ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ. Так па ільнавалакне, замест першага санавіка, РАЁН АБАВЯЗВАЕЦЦА СКОНЧЫЦЬ ЗАГАТОЎКУ 1 ЛЮТАГА. Па трасьце канчатковы тэрмін вызначан таксама на 1 лютага.

На вёску выехалі брыгады ў складзе 75 чалавек. У брыгады вылучаны актывістыя-партыйцы, камсамольцы. За апошні час у загатоўцы ільнавалакна і ільняного семя дасягнут, зрух. Так, калі раней у дзень паступала 2-3 цэнт., дык цяпер паступае 48-50 цэнт. ПАЧАЛАСЯ ЗДАЧА ІЛЬНУ ЧЫРВОНЫМІ АБОЗАМІ.

ПЯТРОЎСКАЯ.

КУЛАК НЕ АТРЫМАЎ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ

ВЕТКА. (Наш кар.). Тэмп загатовак ільнявалакна і ільняного семя не забяспечвае выкананьня плянаў раёнам.

Плян загатовак ільняного семя выкананы толькі на 31 проц., а ільнавалакна—на 3 проц.

Цьвёрдыя заданьні няўсюды даведзены да кулацка-заможных гаспадарак. Не праяўляецца выкананьне кулацка - заможнымі гаспадарамі цьвёрдых заданьняў.

Калгасьнік артелі імя XIII зьезду КП(б)Б за рамонтам с.-г. машыны

Пакараць вінаватых

ЧАРЭЯ. У калгасе Колгас, Чарэйскага раёну на асушаным балоце было засеяна 13 га канапель. Пры дапамозе рабочых брыгад гэтыя канопілі былі ўраны і абмалочаны. У часе малацьбы калгасьнікі пастанавілі здаць канопілі дзяржаве.

Частка канапель тады-ж адразу была здана Райпаляводсаюзу. Другая частка чамусьці засталася ляжаць у калгасе. З прычыны нізкайшых адносін з боку праўленьня калгасу да захаваньня канапель, згніло каля 3 тон.

Бяз зьмен

СУРАЖ. (Наш кар.) У ільназагатоўках—ніякага зруху. На 1 сьнежня плян загатовак ільнавалакна быў выкананы на 6,7 проц., а на 5 сьнежня—на 9,5 проц. Яшчэ горш разгортваюцца загатоўкі ільняного семя. На 1 сьнежня было загатоўлена 33 проц. пляну, а на 5—34 проц.

Голас мільёнаў

Праз межы

шлем шчырае пралетарскае прывітаньне барацьбітом за сусьветны Кастрычнік

Рабочыя, служачыя, інж.-тэх. пэрсанал чырвонасьцяжнага заводу «Энэргія», за слухаўшы даклад прысхаўшых у БССР былых паслоў сойму — кіраўнікоў Беларускай Грамады т. т.: Мятлы і Рак-Міхайлоўскага адзначаюць:

1. Фашысцкі ўрад Польшчы карнымі экспэдыцыямі ў Заходняй Беларусі і Зах. Украіне рыхтуе сабе там пляцдарм для нападу на СССР. Але расьце і рэвалюцыйны ўздым працоўных мас Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, які зьверне шыю польскаму фашызму, і не дапусьціць нападу на Савецкі Саюз.

2. Праз межы і краты, мы шлем шчырае пралетарскае прывітаньне ўсім барацьбітом за справу сацыялізму, якія цяпер знаходзяцца ў турмах капіталістычных краін і абавязуемся адпрацаваць у карысьць палітвязьняў чатыры гадзіны.

3. Мы абавязуемся па-ўдарнаму правесьці абвешчаную ЦК МОПР'у БССР, кампанію па зборы сродкаў для палітвязьняў і выклікаем усе прадпрыемствы Беларусі ўключыцца ў гэту кампанію.

4. Мы заклікаем працоўных Польшчы шчыльней згуртаваць закон КПП, якая вядзе ў цяжкіх умовах фашысцкага тэрору барацьбу супроць фашыстаў і іх лёкаяў сацыял-фашыстаў, а тым, каб хутчэй з Польшчы фашысцкай зрабіць Польшчу—Савецкай.

Шчырае пралетарскае прывітаньне працоўным Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Пакараць

бяз усякай літасьці беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў патрабуюць мопраўцы Менску

Агульна - гарадзкі сход мопраўскага актыву гор. Менску, у ліку 1.000 чалавек, заслухаўшы даклады правадыроў Беларускай Рабоча-Сялянскай Грамады, разгромленай у 1927 г., польскім фашызмам, аб жахлівым белым тэроры ў Польшчы і рэвалюцыйным змаганьні з фашысцкім тэрорам пралетарыяту і працоўнага сялянства Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны,—канстатуе:

Сусьветны крызіс капіталізму ўсё больш паглыбляецца і перарастае ў палітычны крызіс і ўздымае рэвалюцыйны рух пралетарыяту.

Існаваньне Савецкага Саюзу — улады рабочае клясы,—які з вялізарнымі посьпехамі будуе сацыялістычную гаспадарку і які да 13-й гадавіны Кастрычніка ліквідаваў у сабе беспрацоўе, яшчэ з большай сілай рэвалюцыянізуе міжнародны пралетарыят.

Імпэрыялісты і капіталісты шукаюць выхаду з свайго катастрафічнага крызісу, рыхтуючы ўзброены напад на СССР. Імпэрыялісты імкнуцца праз сваіх агентаў контр-рэвалюцыянэраў-шкоднікаў упутры СССР перашкодзіць вялікай сацыялістычнай будоўлі, спыніць хоцьбу выкананьню пяцігодкі за чатыры гады, аб чым сьведчыць выкрытая і асуджаная пралетарскім судом, шкоднічая арганізацыя «прампартыя», а таксама выкрытая ДПУ Беларусі інтэлігенцкая контр-рэвалюцыйная група беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Выкрытая група контр-рэвалюцыянэраў беларускіх нацыянал-дэмакратаў была зьвязана з беларускім нацыянал-фашызмам Заходняй Беларусі ў асобе Луцкевіча, Астроўскага і К°, і складалася з былых міністраў БНР, былых бела-эмігрантаў, якія былі амніставаны савецкай уладай і дапушчаны на адказныя культурныя і гаспадарчыя пасты—ашукала давер'е савецкай улады, яна імкнулася да зьнішчэньня Савецкай Беларусі.

Мопраўскі актыў гораду Менску выказвае сваё абурэньне контр-рэвалюцыйнай работай нацыянал-дэмакратаў, агентаў польскага фашызму—Лёсікаў, Цьвікевічаў, Ластоўскіх і К° і патрабуе самага жорсткага пакараньня для тых, хто імкнуўся крывёю рабочых і сялян ватаніць Савецкую Беларусь і далучыць яе да фашысцкай Польшчы.

У адказ на шалёны тэрор фашыстаў, на ліхаманкавую надрыхтоўку імпэрыялістамі нападу на СССР, у адказ на контр-рэвалюцыйную работу нац.-дэмакратаў, **мопраўцы гораду Менску абавязуюцца з яшчэ большай энэргіяй змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады, за ўдарныя і сацыялістычныя формы і мэтады работы на прадпрыемствах, за паглыбленьне інтэрнацыянальнага выхаваньня сярод шырокіх пралетарскіх мас, за ўзмацненьне дапамогі барацьбітом рэвалюцыі, за ліквідацыю грашовага прарыву па зборы сродкаў на карысьць палітзьняволеных, за 100 проц. выкананьне кантрольных лічбаў па кампаніі зімовай дапамогі палітвязьням і за 100 проц. антыўдзел у справаздачна - перавыбарчай кампаніі саветаў.**

Агульна-гарадзкі сход мопраўскага актыву вітае правадыроў разгромленай Беларускай Рабоча-Сялянскай Грамады — т. т. Мятлу, Рак-Міхайлоўскага, Бурсевіча і аднаго з працаўнікоў Рабоча-Сялянскага Клюбу «Змаганьне» у польскім сойме тав. Грэцкага.

Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі!

Няхай жыве інтэрнацыянальная салідарнасьць міжнароднага пралетарыяту!

Шчырае мопраўскае прывітаньне рэвалюцыйным рабочым і сялянам Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне пралетарыяту за сусьветны Кастрычнік!

Адказ

рабочых саўгасу „Ракавічы"

Агульны сход саўгасу «Ракавічы», Чырвонаслабодзкага раёну, патрабуе ад ураду бязьлітаснага пакараньня контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць нац-дэмаў сход абяцае на 100 проц. уступіць у рады Асоавіяхіму, выканаць і перавыканаць прамфінплян. Калектыў рабочых унесіць у фонд пабудовы дырыжабля імя «Правды» 300 рублёў.

Рабочыя саўгасу далучаюць свой голас да патрабаваньня [illegible] аб узнагародзе ЦВК Беларусі ордэнам Леніна.

„Мы даганяем высокую тэхніку капіталістычных краін і хутка перагонім яе"

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. КАЛІНІНА НА РАДЫЁ-МІТЫНГУ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ

МАСКВА. 17-га сьнежня ў тэатры Радыё-цэнтру адбыўся радыё-сход рабочых-ударнікаў Масквы, Ленінграда і Харкава. Выступіўшы на радыё-мітынгу тав. Калінін сказаў:

У Савецкім Саюзе пачынаюцца перавыбары саветаў—адна з важнейшых палітычных кампаній. Посьпехі намага сацыялістычнага будаўніцтва сапраўды вялізарныя. Пяцігадовы плян рэканструкцыі народнай гаспадаркі Саюзу быў абвешчан буржуазіяй Захаду і Амэрыкі фантастычным, нерэальным. Аказалася, што наша будаўніцтва ідзе выпярэджваючы гэты плян. За апошнія гады мэталюргія і машынабудаўніцтва вырасьлі ў некалькі раз. Уся цяжкая прамысловасьць зрабіла гіганцкі рух наперад. У першыя гады, паказаная эфэктыўнасьць гэтага будаўніцтва невялікая. Кузьнецкабуд, Магнітабуд, Дняпрабуд і дзесяткі іншых гігантаў цяжкай індустрыі не даюць хуткага лёгка-адчувальнага эфэкту ў паляпшэньні матар'яльнага становішча працоўных. Калі-б краіна закупіла заграніцаю вялікую колькасьць бляхоўны і адразу-б выпусьціла ў некалькі раз больш тэкстыльных тканін,—дык палітычныя сьляпцы сказалі-б: «вось, як паляпшаецца добрабыт працоўных». Чыгун і сталь для харчу непрыгодны, аўтамабіль і трактар—не заменяць сапліто і кастэлі. Савецкая ўлада і партыя рыхтуюць магутную базу для тэй галіны прамысловасьці—лёгкай індустрыі, якая дае просты, адразу бачаны эфэкт. Вось таму СССР і ўкладвае вялізарныя сродкі ў цяжкую індустрыю. Мы даганяем высокую тэхніку капіталістычных краін і мы хутка перагонім яе. Гэты рух у нашай культурна адсталай краіне ідзе побач з труднасьцямі, якія неабходна самым рашучым чынам перамагчы. Наша разьвіцьцё ня можа праходзіць гладка, як аўтамабіль на асфальтавай дарозе. Мы акружаны зьнешнімі ворагамі і ліквідуем унутраных ворагаў. Савецкі пралетарыят, які стварае сваёю працаю матар'яльныя каштоўнасьці, зможа ў выпадку вайны абараніць іх ад нападу зьнешніх і ўнутраных ворагаў.

Масква, Ленінград і Харкаў бурна апладыравалі апошнім словам т. Калініна.

У фашысцкай Польшчы

ПРАЦЭС 95 УКРАІНСКІХ СТУДЭНТАЎ

Як падае орган польскіх сацыял-фашыстаў «РОБОТНІК», гэтымі днямі пачаўся ў Стрыі (Заходняя Украіна) вялікі працэс 96 украінскіх студэнтаў па абвінавачаньні іх у належнасьці да нібы тайнага украінскага спартыўнага таварыства.

На працэс выкліканы судом некалькі дзесяткаў сьведак, пераважна агентаў паліцыі і дэфэнзывы. Абаронаю таксама выкліканы цэлы рад сьведак.

Паводле паказаньняў агентаў дэфэнзывы, падсудныя належалі да украінскага таварыства аховы дзяцей і апекі над моладзьдзю ва Львове, філія якога знаходзілася ў Стрыі. Як відома, гэтае украінскае таварыства было разгромлена і закрыта ўвосень гэтага году ў часе ўсеукраінскага пагрому, наладжанага польскім фашызмам.

Як відаць, АГЕНТЫ ДЭФЭНЗЫВЫ ДРЭННА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ПРАЦЭСУ, АБО ДЭФЭНЗЫВА НЕ ПАСЬПЕЛА СФАБРЫКАВАЦЬ УСІХ ПАТРЭБНЫХ ДАКУМАНТАЎ, бо, як паведамляе той-жа «Роботнік», працэс пасьля першага дня расправы адкладзен да 13-га лютага.

Далейшая мілітарызацыя ўраду фашысцкай Польшчы

Як мы падавалі ўжо на старонках «Зьвязды», мілітарызацыя ўраду фашысцкай Польшчы і наогул усёй фашысцкай машыны адбываецца прыспешанымі тэмпамі. Мы зазначалі ўжо, што ў цяперашнім урадзе палкоўніка Славэка засядае 9 генэралаў і палкоўнікаў, прычым большасьць з іх былыя супрацоўнікі і кіраўнікі другога аддзелу генштабу (контр-разьведкі).

У адным з апошніх нумароў органа польскіх сацыял - фашыстаў, «Роботнік», зьмясьціў табліцу, у якой з надзвычайнай яскравасьцю паказвае нам тэмпы гэтай мілітарызацыі. Так, першы габінэт Бартэля ў 1926 годзе меў двух вайсковых і 11 цывільных. Габінэт Пілсудскага ў 1926 годзе меў двух вайсковых і 11 цывільных, другі габінэт Пілсудскага ў 1927 годзе—тры вайсковых і 11 цывільных, другі габінэт Бартэля ў 1928 годзе — тры вайсковых і 11 цывільных. Габінэт Сьвітальскага ў 1929 годзе—6 вайсковых і 8 цывільных, габінэт Бартэля ў 1929 годзе — 4 вайсковых і 10 цывільных, першы ўрад Славэка ў 1930 годзе — 6 вайсковых, 8 цывільных, урад Пілсудскага ў 1930 годзе — 6 вайсковых і 8 цывільных, другі ўрад Славэка ў 1930 годзе—9 вайсковых і 6 цывільных.

Апошнімі часамі ў чыноўніцкіх колах Варшавы пашыраюцца чуткі аб маючых адбыцца далейшых пэрсанальных зьменах на вышэйшых пасадах у розных міністэрствах. Цэлы рад цяперашніх чыноўнікаў звольнены ў адстаўку, а на іх месца пастаўлены асобы «маладзейшыя і больш энэргічныя», пераважна з вайсковых.

Важныя пэрсанальныя зьмены міністэрства замежных спраў ужо адбыліся. Чакаюцца значныя пэрсанальныя зьмены таксама ў міністэрствах прамысловасьці і гандлю, працы, грамадзкай апекі. На пост падсакратара стану ў міністэрстве працы назначаецца вайсковец, пры гэтым называюцца кандыдатуры палкоўнікаў Шубартовіча і Дрэцкага, а таксама генэрала Дрэшэра. Віцэ-міністрам фінансаў ужо назначан палкоўнік Коц.

Акрамя гэтага на чале вышэйшага фінансавага кантролю дзяржавы пастаўлены таксама вайскоўцы. Адным словам, усе важнейшыя і адказьнейшыя пасты ва ўрадзе абсаджаны вайскоўцамі, былымі натхніцелямі «ваеннага паходу на Кіеў», і заядлымі ненавісьнікамі СССР першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. Гэта мілітарызацыя ўраду гаворыць ужо сама за сябе і мае на мэце падрыхтоўку новага ўзброенага паходу на СССР. Аб гэтым пралетарыят БССР ніколі не павінен забываць.

Масавыя арышты ў Халме

Эндэцкая «Газэта Варшаўская» падае, што 12-га сьнежня адбыліся масавыя вобыскі сярод рэвалюцыйных рабочых у Халме. У выніку арыштавана 10 асоб. У арыштаванай Гітлі Барштэйн нібы захоплена вялікая колькасьць камуністычнай літаратуры.

***

Апошнімі днямі па падазрэньні ў належнасьці да украінскай вайсковай арганізацыі зноў праведзены масавыя вобыскі і арышты сярод украінскай вучнёўскай моладзі ва Львове. Арыштаваны вучні гімназіі—П. Рыжка, Ю. Майда, Ю. Рушчын, С. Лучык, А. Бондар, В. Яцкіў, Р. Лебытовіч і Ю. Ваньчун і інш.

Вось як выглядае на справе «ўціхаміраньне» Зах. Украіны, аб якім так пядаўна яшчэ расьпіналася фашысцкая польская прэса.

З-за несвячасовай падачы электраэнэргіі Эльводам, сёнешні нумар выходзіць у разьмеры 4-х старонак. Матар'ялы сэсіі ЦВК будуць зьмешчаны ў заўтрашнім нумары, які выходзіць у павялічаным разьмеры—6 старонак.

Амэрыканскія пралетары

дэманструюць сваю гатоўнасьць абараняць СССР

Рабочыя дэманстрацыі ў Нью-Ёрку

Кампартыя арганізуе мітынгі па ўсей краіне

НЬЮ-ЁРК, 13. Учора адбылася арганізаваная кампартыяй дэманстрацыя рабочых абароны Савецкага Саюзу. Дэманстрацыя накіравалася да французкага консульства, якое знаходзіцца ў дзелавым квартале Нью-Ёрку. Дэманстранты ішлі з плякатамі, выкрываючымі дзейнасьць імпэрыялістаў, падрыхтоўваючых ваенны напад на СССР і зьвязаных са шкоднікамі ў СССР. Паліцыя, узброеная дубінкамі, прабавала адабраць антыімпэрыялістычныя плякаты, але дэманстранты аказалі значнае супраціўленьне. Паліцыя пусьціла ў ход дубінкі і многіх дэманстрантаў паранила. Шмат арыштаваных. Пасьля жорсткай схваткі паліцыі ўдалося расьсеяць дэманстрантаў. Увесь дзень ля французкага консульства дзяжурылі паліцэйскі атрад.

Орган кампартыі «Дэйлі Уоркер» выпусьціў спэцыяльны выпускам яркае к моманту дэманстрацыі. Усяго за апошнія дні ў Нью-Ёрку і яго ваколіцах адбылося 15 мітынгаў, прайшоўшых пад знакам абароны Савецкага Саюзу, выкрыцьця ваенных плянаў імпэрыялістаў і пратэсту супроць змовы шкоднікаў, супроць дзейнасьці камісіі Фішэ і спроб забараніць увоз савецкіх тавараў. У мітынгах прымала ўдзел некалькі тысяч чалавек. Таварыства прыяцеляў СССР і кампартыя арганізуюць мітынгі па ўсёй краіне, з мэтай мабілізаваць рабочых для абароны Савецкага Саюзу.

(ТАСС).

ГЭРАІЧНАЕ ЗМАГАНЬНЕ КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Пры дапамозе імпэрыялістаў Чан-Кай-шы пачаў наступленьне супроць чырвоных

Жорсткія баі на поўдні правінцыі Цьзянсі

ШАНХАЙ, 17. Пачынаюць паступаць весткі аб жорсткіх баёх на поўдні правінцыі Цьзянсі, дзе чырвоная армія аказваюць гэраічнае супраціўленьне наступаючым супроць іх войскам панкінскага ураду. Амэрыканскі орган «Івінг Пост» апісвае становішча на поўдні Цьянсі наступным чынам: «Урадавыя войскі ўступілі на тэрыторыю, занятую раней чырвонымі. Зараз там адбываюцца сур'ёзьнейшыя баі. Урадавыя войскі знайшлі сельскія мясцовасьці яусім пустымі, бо ў іх засталіся толькі старыя жанчыны. Мужчынскае насельніцтва далкам далучылася да чырвоных армій. Маладыя жанчыны таксама далучыліся да войск, выконваючы дапаможныя функцыі. Урадавыя войскі захапілі рад нязначных пунктаў у раёне, тым ня менш увесь раён усё яшчэ знаходзіцца над уплывам «Чырвонай армі, з-за чаго салдаты урадавых войск адчуваюць значныя затрудненьні». (ТАСС).

ШАНХАЙ, 17. Газэта «Чайна Уоркер Карэспандэнт» падрабязна апісвае становішча на паўднёвым усходзе правінцыі Цьянсі, дзе звыш 30 акруг знаходзіцца ў руках Чырвонай армії. Побач з урадамі, створанымі ў пасобных акругах, арганізаваны савецкі ўрад усяго паўднёва-усходняга Цьянсі, які апіраецца ня менш, чым на 4 млн. рабочых і сялян. Урад мае ня менш, чым алзін мільён байцоў, адны з якіх узброены пікамі, а другія самадзельнымі стрэ

Разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі—

зарука пасьпяховага змаганьня з ухіламі ад генэральнай лініі партыі

НІЯКАЙ ЛІТАСЬЦІ АПАРТУНІСТАМ—НЕПАСРЭДНЫМ ДАПАМОЖНІКАМ КУЛАЦТВА, ШКОДНІКАЎ, САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ І ІНТЭРВЭНТАЎ

На лінію агню

Лёзунг партыі аб шырокім разгортваньні пралетарскай самакрытыкі, крытыкі зьнізу да верху і зьверху да нізу, ня гледзячы на асобы,—магутная зброя ў змаганьні з бюракратычнымі скажэньнямі партыйнай лініі ў савецкім апараце, а таксама і з элемэнтамі бюракратызму ў партыйным апараце, што назіраецца ў паасобных нізавых зьвеньнях партыйнай арганізацыі.

Асноўнай умовай пасьпяховага выкананьня вялікіх і складаных задач сацыялістычнага будаўніцтва, перамогі труднасьцяй, якія сустракаюцца на шляху гэтага будаўніцтва, зьяўляецца далейшае неаслабнае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, тэй самакрытыкі, якая забясьпечвае найлепшае практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і бязьлітасную барацьбу з правым, «левым» апартунізмам і прымірэнчымі адносінамі да яго.

У рэканструкцыйны перыяд, перыяд абвостранага клясавага змаганьня ў сувязі з шырока разгорнутым па ўсім фронце перамежным сацыялістычным наступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі патрабуюцца павышэньне клясавай пільнасьці, бальшавіцкай выразнасьці і адказнасьці ў рабоце кожнага зьвяна партыйнай арганізацыі, савецкага, гаспадарчага і кааперацыйнага апарату. На ўсякія моманты нядбайнасьці, чыноўніцкага самазадавальненьня, бюракратычна-казённых адносін да абавязкаў практычнага ажыцьцяўленьня баявых задач партыі, на факты апартуністычнага скрыўленьня партыйнай лініі павінен накіроўвацца зьнішчальны агень самакрытыкі. Самакрытыка садзейнічае пасьпяховаму зьнішчэньню недахопаў у рабоце і выкарчоўваньню рэштак бюракратычных і шкодніцкіх элемэнтаў у органах пралетарскай дыктатуры, у нашых гаспадарчых і кааперацыйных апаратах.

Асабліва вялікае значэньне набывае самакрытыка ў змаганьні з апартуністычнымі элемэнтамі ў радах партыі. Правыя апартуністы, выкрытыя партыяй перад шырокімі партыйнымі і беспартыйнымі пралетарскімі масамі, як кулацкая агентура ў радах партыі, не адважваюцца адкрыта выступаць у абарону сваёй капітулянцкай, па сутнасьці кулацкай, ідэалёгіі, якая адлюстроўвае імкненьні розных выкрытых і жорстка пакараных рукой пралетарскай дыктатуры контр-рэвалюцыйных груп—агентаў міжнароднага капіталу, ідэалёгаў капіталістычнай рэстаўрацыі ў нашай краіне.

Апартуністы ўсіх масьцей, асабліва правыя, зараз ужываюць новы манэўр у сваёй антыпартыйнай дзейнасьці. Яны фармальна прызнаюць свае памылкі, фарызльна заяўляюць аб сваёй згодзе з генэральнай лініяй партыі, а на справе гэтага не пацьвярджаюць і, больш таго, становяцца на шлях фракцыйнай падрыўной работы, бясспрынцыпна блёнуючыся правым з «левымі» на аснове пляцформы правага апартунізму. Дзейнасьць нядаўна выкінутых з партыі двурушнікаў РУЦІНА, КАЎРАЙСКАГА, НУСІНАВА і інш. здраднікаў, рашуча асуджаных партыяй апартуністаў тыпу права-«лявацкага» блёку (Сырцоў, Ламінадзэ, Шацкін), прымірэнчыя адносіны да актывізацыі апартуністаў з боку былых підэраў правага ўхілу РЫКАВА, ТОМСКАГА і інш. найлепш сьведчыць аб тым, што апартуністы яшчэ не зпакылі сваёй зброі змаганьня супроць партыі, а чакаюць больш спрыяючага моманту для аднаўленьня атакі на партыю. Адгэтуль задача кожнай партыйнай арганізацыі, кожнай ячэйкі, шырока выкарыстоўваючы бальшавіцкую самакрытыку, выкрываць і бязьлітасна біць па канкрэтных носьбітах правага і «левага» апартунізму, апартунізму тыпу права-«лявацкага» блёку і па ўсіх правях прымірэнчых адносін да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. Агнём самакрытыкі выкарчоўваць усе недахопы і хваравітыя зьявішчы ў рабоце па ажыцьцяўленьні задач рэканструкцыйнага пярыяду. Неаслабна ўзбройваючы шырокія працоўныя масы пралетарскай самакрытыкай, трэба самым уважлівым чынам сачыць за фактамі заціску самакрытыкі і вінаватых у гэтым прыцягваць да самай суровай адказнасьці.

„Пытаньне крытыкі трэба ўзгадніць“

У камуне Бухарына - Пралетарская (Касьцюковіцкі раён) панує недапушчальная безгаспадарчасьць. Сельскагаспадарчы інвэнтар валяецца без догляду пад адкрытым небам, іржавее і псуецца. Штучнае ўгнаеньне таксама раскідана па двары. Няма пілкага догляду за жывёлай. Бываюць такія выпадкі, калі каровы цэлымі начамі ходзяць па вуліцы. У анлаце працы камунараў існуе блытаніна, некаторыя асобы замест 4-6 гадзін фактычнай работы атрымліваюць плату за 8-12 гадзін і наадварот.

Наяўнасьць такіх адмоўных зьявішч тлумачыцца слабым кіраўніцтвам вытворчасьцю і жыцьцём камуны з боку парт'ячэйкі і адсутнасьцю пралетарскай самакрытыкі. Ячэйка ня ўжыла адпаведных захадаў для шырокага разгортваньня самакрытыкі, як магутнага сродку ў справе зьнішчэньня моментаў безгаспадарчасьці і інш. хваравітых зьявішч у камуне. Наадварот сакратар парт'ячэйкі камуны тав. Мацьвеенка ўсякія імкненьні камунараў крытыкаваць нядбайнасьць савету камуны ці слабую работу грамадзкіх арганізацый абмяжоўвае, а часамі ўсім забаранне крытыкаваць. Такія факты мелі месца ў часе выпуску жывой газэты. Калі калектыў жывой газэты пачаў дэманстраваць на сцэне факты безгаспадарчасьці з боку кіраўніцтва камуны, дык Мацьвеенка зьявіўся на сцэну і пачаў даводзіць, што нельга крытыкаваць кіраўніцтва, ня ведаючы ўсіх умоў жыцьця камуны.

Асабліва ўсхвалявала Мацьвеенку крытыка сакратара камсамольскай ячэйкі, які замест работы ўвесь вольны час займаецца гульнёй у карты. Мацьвеенка забараніў крытыкаваць сакратара яч. ЛКСМБ па матывах, што **раней, чым крытыкаваць, трэба ўзгадніць аб гэтым пытаньне з загадчыкам культпропу РК.**

Зразумела, што сакратарскія «даводы» ўпэўнілі камунараў толькі ў яго боязьні самакрытыкі і парушэньні дырэктыў партыі аб сьмелым разгортваньні самакрытыкі, ня гледзячы на асобы.

Міхайлаў.

Апартуністы глушаць ініцыятыву мас

На калодзічна-цьвіковай фабрыцы «Праца» (Чэрвень) адсутнічаюць усякія пляны работы, вытворчыя праграмы і г. д. Партыйцы ў сваёй большасьці адбіваюць настрої адсталых груп рабочых і на чале з дырэктарам лічаць, што ніякія пляны для фабрыкі непатрэбны.

Партыйная ячэйка не змагаецца з апартуністычнымі настроямі паасобных камуністаў, з прагуламі, якія дасягаюць вялікага процанту на фабрыцы.

Райком партыі, які добра ведае аб становішчы на фабрыцы «Праца», да гэтага часу не палічыў патрэбным аздаровіць партыйнае кіраўніцтва, дапамагчы ячэйцы выправіць недахопы. Райкомам некалькі месяцаў таму назад была складзена камісія, якой даручалася праверыць партыйную і гаспадарчую работу на фабрыцы, але... камісія да сёньняшняга дня не сабралася.

На апошнім пленуме райкому партыі выступаючы **сакратар ячэйкі фабрыкі «Праца»** адкрыта заявіў, што «мы ня можам пасьпяхова ва сучасных тэмпамі будаўніцтва, бо рабочыя фабрыкі знаходзяцца ў горшых умовах, чым рабочыя індустрыяльных цэнтраў».

Асноўнай прычынай таго, што правыя апартуністы ў Чэрвеньскай раённай партарганізацыі падчас адкрыта прапаведуюць свае погляды, зьяўляецца адсутнасьць крытыкі і самакрытыкі ў гэтай арганізацыі.

Раённая газэта **«Калектывіст»**, а таксама насьценныя газэты працуюць вельмі дрэнна. У «Калектывісьце» зьмяшчаецца казённы пратакольны матар'ял, які даецца ў большасьці раённымі работнікамі і тымі, «хто па службовым становішчы абавязан пісаць у газэту». Нізавы друк не выкрывае фактаў заціску самакрытыкі.

Сярод настаўніцтва ёсьць частка людзей, якія цалкам скарыстоўваюць бязьдзейнасьць партыйных ячэек і дапамагаюць кулацтву весьці шалёную агітацыю супроць калгасаў.

Крытыка і самакрытыка недахопаў у рабоце партарганізацыі не зьяўляюцца тэй зброяй, пры дапамозе якое можна было-б зьнішчыць вялізарныя прарывы ў рабоце Чэрвеньскай партарганізацыі. Заслугоўвае ўвагі і той факт, штобо ні адна раённая ўстанова не рэагуе на заметкі, якія зьмяшчаюцца аб Чэрвеньскім раёне ў цэнтральным друку або дасылаюцца на расьсьледваньне.

Партыйныя ячэйкі і райком ня ўлічылі ўсёй важнасьці работы з рабселькорамі. За апошні час былі спробы склікаць канфэрэнцыю рабселькораў, але ні адзін з сельскораў на гэту канфэрэнцыю не зьявіўся, бо сярод іх не праводзілася ніякай работы.

Некалькі дзён таму назад пленум райкому прыняў пастанову аб абвяшчэньні рэйду на правэрцы рэагаваньня на рабселькораўскія заметкі. Мы лічым, што на правядзеньне гэтага рэйду павінна быць зьвернута максымальная ўвага ня толькі з боку райкому, але і ўсіх партыйных ячэек, саветаў і камсамольскай арганізацыі.

Рэйд павінен выкрыць асоб, якія ня хочуць рэагаваць на рабселькораўскія заметкі і ігнаруюць дырэктывы партыі аб разгортваньні самакрытыкі.

А. МАНЬКОЎ.

Пяршынства заваявана

У Тэгеране скончаны міжнародныя выпрабаваньні самалётаў. Савецкія самалёты ва ўсіх адносінах заваявалі пяршынства. Зараз зьвяно савецкіх самалётаў у складзе 3-х машын пад кіраўніцтвам старшага лётчыка тав. Ліхавецкага вылецела з Тэгерану ў Маскву. На здымку—лётчыкі-пераможцы.

Выклікаем на дапамогу палітзьняволеным капіталістычных турмаў

Мы, члены ячэйкі МОПР'у **Белпільнасаюзу: Рыжынаў, Паваротны, Аўчыньнікаў, Вішнеўскі і Лаціс** уносім кожны па 5 руб у фонд зімовай дапамогі палітвязьням капіталістычных турмаў. Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу наступных т. т.: **Ягорава, Надбальскага, Пыжыкава, Ісакава, Янушка, Журанкова, Панамарова, Жырынава, Загараньскага, Сенчука, Мазура, Баршая, Дамарацкага, Нячотнага, Пыжыка, Завусьцінскага, Брушко і Гамалея.**

Хваля крывавага тэрору

ЗАЛІВАЕ ЗАХ. БЕЛАРУСЬ

Усюды турма, турма і турма

13.000 ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ ПАКУТУЮЦЬ У КАМЕННЫХ МЯШКОХ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

ГУТАРКА З б. ГЕНЭРАЛЬНЫМ САКРАТАРОМ ГРАМАДЫ М. БУРСЭВІЧАМ

Якое ваша ўражаньне ад усяго таго, што ўбачылі тут, у Савецкай Беларусі?

—Тое, што давялося ўбачыць за гэты кароткі час, мяне проста такі ашаламіла. Тыя волаты-дамы для жыльля рабочых, тыя гіганты фабрыкі і заводы, у якіх працуюць тысячы пралетараў, той энтузіязм, той уздым сярод усяго агулу сустраканых мною груп насельніцтва ня можа не захапіць, ня можа ня зьдзівіць. Усюды нарыў да працы, усюды заўзятасьць, самавызначальнасьць тэмпаў гэтае працы, усюды ажыцьцяўленьне слоў на справе!

Зусім адваротнае пагляданецца там, на другім боку мяжы, у **Заходняй Беларусі**, якая стогне пад ботам польскага акупанта. Там шалёны тэрор бушуе крывавай хваляй. Асабліва фашысцкі тэрор узмоцніўся ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне ў апошнія часы. Карныя экспэдыцыі, масавыя аблавы, вобыскі на ўсім абшары Зах. Беларусі, масавыя збойствы і катаваньні працоўных па дэфэнзывам—вось штодзённае зьявішча. Асабліва гэты тэрор шалеў у часе выбарчай кампаніі, а таксама—і ў часе саміх выбараў у сойм. Калі выбары ў 1922 годзе ў польскі сойм далі турмам 1.500 чалавек рэвалюцыйнага актыву, а пры выбарах у 1928 годзе ва настрожнымі кратамі апынулася каля 3.000 чалавек гэтага актыву, дык у выбарчую кампанію ў сойм у лістападзе бягучага году было кінута ў турмы каля 6.000 асоб. Асабліва энэргічна дапамагалі польскай дэфэнзыве ў гэтым беларускія нацыянал-фашыстыя Астроўскі, Луцкевіч і К°. Не адна сотня лепшых прадстаўнікоў працоўных мас ЗБ кінута ў турмы па іх указаньні.

У цяперашні час у турмах фашысцкай Польшчы знаходзіцца каля 13.000 палітвязьняў. Сярод іх ёсьць асобы, якія ўжо па 8 год блаўхадна сядзяць за тое, што зьбіралі подпісы на рабочасялянскія выбарчыя сьпісы. Тэрор у часе апошніх выбараў быў ня толькі жудасны, а проста нячуваны. У часе выбараў у Зах. Беларусі было зарыштавана і пасаджана за краты каля 80 проц. усяго актыву. Арыштаваных мучылі катаваньнямі: білі гумовымі палкамі па галаве, па пятах, асабліва ў пячонкі, марылі голадам і холадам, не давалі вады, улівалі па некалькі літраў вады з воцтам праз нос у жывот.

Тэрор у фашысцкай Польшчы праяўляецца кожны дзень, кожную гадзіну, на кожным кроку: не даваляюць сялянам зьбірацца на сходы і гутарыць аб сваіх штодзённых патрэбах, разганяюць пасольскія мітынгі, прасьледуюцца і закрываюцца культурна-асьветныя т-вы, каапэрацыйныя арганізацыі, грашовыя карамі (штрафамі) разбураюцца сялянскія гаспадаркі, да крывавіі зьбіваюцца паслы—прадстаўнікі рэвалюцыйных рабочых і сялян. Гэтак былі зьбіты да крыві паслы Мятла і Валошын у Стара-Беразове ў 1927 г., былі акрываўлены б. паслы «Змаганьня» Дварчанін, Гаўрылік, Вальнвец, Грэцкі, а якіх першыя тры і зараз пакутуюць ў вастрожных мурох.

Сваімі пратаколамі паліцыя я тэрарызуе працоўных у Зах. Беларусі. За дошчачку пры хаце, за дошчацку пры возе, за крук і венік пры хаце, за бочку каля хаты, за «славойкі»—за непабелку коміну ці паркану, за цесны падворак або за непачыставаньне паліцэйскага, сялянін атрымлівае пратакол за пратаколам. За пратаколамі ідуць штрафы, а за штрафамі арышты і турма.

Фашысцкі тэрор лютуе ня толькі ў адносінах да рэвалюцыйных рабочых і сялян на волі. У турмах, куды кідаюцца лепшыя прадстаўнікі пралетарыяту і працоўнага сялянства, фашысцкія каты ўжываюць усе мэтады да поўнага фізычнага зьнішчэньня сваіх ахвяр. Кожнага арыштаванага спачатку катуюць у дэфэнзыве потым яго ізалюць, каб загаіліся раны і сінякі, потым—адзіночка, пазбаўленьне газэт, кніжак, пазбаўленьне харчовай дапамогі ад бацькоў і сваякоў і іншыя зьдзекі. Аб колькасьці галадовак палітвязьняў у польскіх турмах ужо ня прыходзіцца гаварыць. Гэта амаль штодзённае зьявішча.

Цярпяць палітвязьні ў фашысцкай Польшчы як нідзе. Толькі дзякуючы энэргічнай дапамозе МОПР'у, сьмяротнасьць сярод іх не такая жахлівая, якая была-б без гэтага падтрыманьня. Трэба сказаць, што турэмныя харчы і рэжым у турмах фашысцкай Польшчы такія, што без падтрыманьня з боку самы здаровы чалавек ня вытрымаў-бы больш паўгода. Падтрыманьне МОПР'у, хаця і нязначнае і нерэгулярнае, падмацоўвае ізаляванага ад сьвету змагара і налае яму энэргію для змаганьня ў будучым.

Тав. Бурсэвіч

Беларускія пачатковыя школы ў ЗБ зусім ліквідаваны. Беларускія культурна-асьветныя арганізацыі разграмляюцца, кіраўнікі іх арыштоўваюцца і садзяцца ў турмы. Забараняюцца спэктаклі і лекцыі, забараняюцца вучнёўскія сходы, музычныя вечарынкі. А тых, хто адважыцца пайсьці да старасты з просьбай аб дазволе на пастаноўку ў сялянскай хаце якой-небудзь п'есы, чакае суровая кара за турэмнымі кратамі. Як бачыце, якую галіну жыцьця ня возьмеш, усюды тое самае: **турма, турма і турма.** У газгроме беларускіх культурна-асьветных арганізацый і устаноў, у прасьледваньні нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас, у масавых аблавах і арыштах—ва ўсім гэтым актыўна дапамагаюць польскаму фашызму беларускія нацыянал-фашысты,—гэтыя агенты польскай дэфэнзывы. Яны энэргічна дапамагаюць польскаму фашызму ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу. Гэта па іх указаньні сотні лепшых прадстаўнікоў беларускіх працоўных мас кінуты ў апошнія часы за турэмныя краты. Гэта яны, таксама, як і тут у БССР контр-рэвалюцыйная група нацыянал-дэмакратаў, усямерна дапамагаюць падрыхтоўцы інтэрвэнцыі з боку польскага імпэрыялізму для зьнішчэньня Савецкай Беларусі.

Бачачы вашы дасягненьні ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, я без абурэньня не магу слухаць аб контр-рэвалюцыйнай рабоце нацдэмаў, якія стараліся ўсямерна перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву і абярнуць Савецкую Беларусь у калёнію польскага фашызму. Падрыхтоўка інтэрвэнцыі польскім фашызмам ідзе вельмі шпаркімі тэмпамі. Ды і ня толькі цяпер яна ідзе. Адбывалася яна і раней. Амаль на ўсіх палітычных працэсах толькі і гутаркі з боку фашысцкага суда, што аб небясьпецы з боку Савецкага Саюзу. Тое самае было і ў часе працэсу Грамады. Тры чвэрці ўсіх пытаньняў было аб небясьпецы з боку саветаў. Польскаму фашызму патрэбна было гэта для абаламучаньня працоўных мас, каб можна было кінуць іх на вайну супроць СССР.

Але павінен адзначыць, што працоўныя масы Зах. Беларусі добра разьбіраюцца і разумеюць усе гэтыя панскія хітрыкі. Пралетарыят і сялянства ўважліва прыглядаюцца да таго, што робіцца на Усходзе, як тут ажыта беспрацоўе, як адбудоўваецца гаспадарка, у якой пашане знаходзіцца родная школа і родная мова. Працоўныя масы ЗБ чакаюць, каб фашысты іх мабілізавалі і далі ім у рукі зброю, каб павярнуць яе супроць сваіх векавых прыгнятальнікаў—польскіх памешчыкаў.

Анэксыйныя апэтыты польскіх імпэрыялістаў растуць. Фашыстам сьніцца польскі Кіеў, вялікая Польшча «ад мора да мора». У вайне з СССР польскі фашызм бачыць выхад з таго цяжкага эканамічнага крызісу, які яна зараз перажывае. Падрыхтоўка ўзброенага паходу супроць СССР адбываецца ў Польшчы шалёнымі тэмпамі. Але сьвядомасьць пралетарыяту Польшчы ўжо ня тая, што ў 1920 годзе. Рабочыя масы і працоўнае сялянства ў выпадку вайны здолеюць убіць у сэрца буржуазнай гідры асінавы кол.

НАСУСТРАЧ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ

НАСЕНФОНДЫ, РАМОНТ, ПЛЯНЫ—усё яшчэ небясьпечны вучастак

ЦЕСНА ЗЬВЯЗВАЮЧЫ ПАДРЫХТОЎКУ ДА БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ З АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ, ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

ЧА БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ—ПРАВЫМІ ЎХІЛІСТАМІ, ЯКІЯ НЕ ЖАДАЮЦЬ АРГАНІЗОЎВАЦЬ МАСЫ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ДРУГОЙ КАЛГАСНАЙ СЯЎБЫ. РАШУЧЫ АДПОР „ЛЕВАКОМ“, ЯК Я, ІМКНУЧЫСЯ ПАДМЯНІЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ АДМІНІСТРАВАНЬНЕМ І ПРЫМУСАМ, ЛЬЛЮЦЬ ВАДУ НА МЛЫН КЛЯСАВАГА ВОРАГА

На подступах да вясны

Пазначаныя партыяй і ўладай мерапрыемствы да другой бальшавіцкай вясны павінны карэнным чынам зьмяніць твар сельскай гаспадаркі БССР. Перад беларускай вёскай, якая перабудоўваецца на сацыялістычны лад, пастаўлены наступныя асноўныя задачы:

Давесьці яравы клін сацыялістычнага сэктару да 37 проц. агульнай плошчы веснавых пасеваў (замест 18 проц. у мінулым годзе)

Пашырыць насеўную плошчу на 17,1 проц.—на 400.000 гэктар.

Спэцыялізаваць сельскую гаспадарку ў напрамку разьвіцьця тэхнічных і кармавых культур.

Асноўная ўмова пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтай праграмы—далейшае разгортваньне калгаснага руху на аснове добраахвотнага ўступленьня бядняцка-сераднякіх мас у калгасы.

«Дэкада калектывізацыі і ўраджаю» выразна паказала, якія вялізарныя магчымасьці закладзены ў сапраўды па-бальшавіцку арганізаванай масавай растлумачальнай кампаніі за аб'яднаньне адзінаасобнікаў - беднякоў і сераднякоў у калгасы. На працягу часу з 15 да 25 лістапада па БССР было калектывізавана звыш 3.760 новых двароў. Вялізарную ролю ў арганізацыі гэтай калгаснай хвалі адыгралі ініцыятыўныя групы з адзінаасобнікаў і калгасныя вярбовачныя камісіі, якіх на працягу дэкады было створана больш, чым у 1.380 пунктах. Практыка ініцыятыўных груп паказала, што яны сапраўды зьяўляюцца новымі апорнымі пунктамі сацыяльнай калектывізацыі.

Працэс «прамартыі», выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнай групы нацдэмаў, як агентаў польскага фашызму, актывізацыя інтэрвэнтаў—выклікалі ўзмаканьне руху бядняцка-сераднякіх мас БССР, асабліва пагранічных з Польшчай раёнаў, за калгас. У радзе месц, аднак, новы калгасны прыліў прынялае стыхійна. Мясцовыя партыйныя арганізацыі не стаяць на чале гэтага прыліву (напрыклад, Сьмілавіцкі раён). У значнай частцы раёнаў растлумачальная кампанія ня носіць сыстэматычнага характару, а праводзіцца час ад часу.

Перавыбарчая кампанія саветаў, якая зараз адбываецца, яшчэ далёка ня ўсюды ўвязана з задачамі калектывізацыі. Ёсьць, праўда, бліскуючыя ўзоры правядзеньня перавыбараў пад кутом погляду палітычных задач, высунутых партыяй. Прыкладам служыць далёкі Каралінскі раён, які мабілізаваў масы ў часе перавыбораў і завастрыў іх увагу на яўна невыстарчальным удзеле сельсаветаў у сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Партыйная арганізацыя гэтага раёну абярнула перавыбарчую кампанію саветаў у кампанію за ўзмаканьне калгаснага руху, за неадкладнае жортваньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. І ў выніку—прыліў у калгасы Каралінчыны, масы калгасьнікаў і зінаасобнікаў ужо пачалі тут рыхтацца да вясны, да выкананьня яе вялізарных вытворчых задач (абмяркоўваць планы, ствараюць насенныя клады).

Практыка Каралінскага раёну не ўнікавая. Паступова і іншыя, асабліва суседнія з ім раёны, скарыстоўваюць практыку Каралінчыны, дасягаючы тых-жа посьпехаў. Найлепшым прыкладам служыць таксама практыка калгасу «Перамога» ў Расьнянскім раёне, практыка Бялынніцкага раёну.

Аднак, ёсьць яшчэ ў БССР каля дзесяці раёнаў, у якіх процант калектывізацыі не перавышае 10 проц. (у сярэднім па рэспубліцы калектывізавана больш 14 проц. двароў). У гэтых мясцох асабліва слабая масавая работа па арганізацыі прыліву ў калгасы, у такіх раёнах і кампанія перавыбараў у саветы праходзіць ня зусім здавальняюча. Надыходзячая веснавая сяўба настойліва патрабуе, каб неадкладна разварушыліся адсталыя раёны, якія, скарыстоўваючы вопыт перавыбарчай кампаніі Каралінчыны, вопыт ініцыятыўных груп, вярбовачных камісій і іншых лепшых прыкладаў масавай работы, павінны дабіцца палежнага росту калгаснага руху, увязкі падрыхтоўкі да веснавой сяўбы з арганізацыяй новага прыліву.

Праграма другой калгаснай вясны зьяўляецца новым ударам па кулаку і яго агентуры—правых і «левых» апартуністах. Гэта праграма ўжо ў радзе месц выклікала актывізацыю клясавага ворага і апартуністычных элемэнтаў, якія прабуюць перашкодзіць яе ажыцьцяўленьню.

Зусім відавочна, што 20 машына-трактарных станцый, якія да вясны арганізуюцца ў БССР, ня могуць замяніць конскую цягавую сілу. Павялічэньне яравога кліну на 17,4 проц., наадварот, патрабуе напаўненьня раду калгасаў і саўгасаў коньмі. Між тым, у радзе раёнаў за апошні час пачалося разбазарваньне коняй калгасамі. Гэта бясспрэчны вынік кулацкага манэўру, вынік агітацыі клясавага ворага, што «калгасы атрымаюць трактары, коні ім не патрэбны». Апартуністы, якія заселі ў радзе калгасных і вясьмельных органаў, сваёй бязьдзейнасьцю спрыяючы разбазарваньню калгасамі коняй, аказваюць непасрэдную дапамогу кулаку.

Імкнучыся затармазіць калгасны рух, кулак асабліва моцна ўзяўся за апрацоўку адзінаасобніка, які зьбіраецца ў калгас. Кулак угаварвае адзінаасобніка перад уваходам яго ў калгас прадаць свайго каня, карову, заяўляючы, што калгас не адчувае патрэбы ў цягавай сіле і ў прадукцыйнай жывёле, бо «ёсьць дастаткова колькасьць трактараў і няма куды зьмясьціць і тую жывёлу, якую калгасы зараз маюць». І тут зноў на дапамогу кулаку выступаюць апартуністы, якія не арганізуюць растлумачальнай кампаніі сярод адзінаасобнікаў, не выкрываюць сапраўднага сэнсу кулацкай агітацыі.

Наадварот, апартуністы спрыяюць разбазарваньню жывёлы адзінаасобнікамі, лічачы, што «пры існуючым напружаным кармавым балянсе калгасаў карысна спыніць камплектаваньне іх новай жывёлай». Так, замест прыняцьця энэргічных мер для паляпшэньня кармавой базы ў калгасах (пераразьмеркаваньне кармоў у сацыялістычным сэктары, эканомнае выдаткоўваньне кармоў і г. д.) галавацяпы і яўныя апартуністы лічаць за лепшае «на час» затрымаць разьвіцьцё і рост сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Рамонтная кампанія ня толькі не разгорнута, але нават не пачата.

Амаль такі-ж малюнак і з засыпкай насенных фондаў.

Пастанова ўраду прадугледжвае стварэньне да 1 студзеня насенных фондаў у калгасах у разьмеры 460 тысяч тон і страхавых—46 тысяч тон. Ужо прайшла палова сьнежня, а насенных фондаў васыпана толькі 18.336 тон, страхавых-жа—1.091 тона. Злачынна мала ўвагі месцы аддаюць стварэньню насенных фондаў кармавых і тэхнічных культур. Фондаў гэтых культур калгасы яшчэ амаль нідзе не стваряюць. Стаўка на завоз насеньня тэхнічных і кармавых культур у большасьці раёнаў яшчэ не ліквідавана. Загатоўка гэтых культур унутры раёнаў фактычна непачата. Абмен гатунковага насеньня на простае і наадварот ідзе вельмі слаба. Некаторыя калгасы (напрыклад, Тураўскага раёну) скормліваюць гатунковы авёс і не абменьваюць яго на просты.

Да збожжаачысткі ў пераважнай большасьці раёнаў не прыступілі. Трыеры і сартыроўкі ў паралак яшчэ ня прыведзены. У Тураўскім раёне, напрыклад, больш 36 збожжаачышчальных машын, але пачаць збожжаачыстку нельга, бо ні адна з іх не адрамантавана і няма запасных частак. Такое-ж становішча і ва многіх іншых раёнах.

Са справаздач 72 раёнаў відаць, што райкалгасасаюзамі плян даведзен усяго толькі да 248 калгасаў у той час, як у БССР налічваецца зараз 3.864 калектывы.

Партыйныя арганізацыі павінны зараз пытаньне падрыхтоўкі да сяўбы паставіць у цэнтры сваёй увагі, разгарнуўшы вялікую работу па мабілізацыі мас калгасьнікаў і адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў—на выкананьне вялізарнай праграмы другой калгаснай вясны. Змагаючыся за гэту праграму, трэба памятаць, што вытворчыя задачы пасеўнай кампаніі цесна зьвязаны з разгортваньнем калгаснага руху, што асноўная варука посьпеху надыходзячай веснавой кампаніі залежыць ад таго, наколькі падрыхтоўка і выкананьне мерапрыемстваў да веснавой сяўбы будуць увязаны з арганізацыяй новага магутнага калгаснага прыліву.

Кулаком, якія усімі мэтаднямі будуць дабівацца арыву баявой бальшавіцкай праграмы, павінен быць дан руйнуючы адпор. Бязьлітасная барацьба павінна быць абвешчана кулацкім агентам—правым ухілістам, якія адмаўляюцца ад далейшага наступленьня на кулака і, называючы зацьвярджаньня партыяй і ўрадам пляны «нерэальнымі», ня могуць і не жадаюць мабілізаваць масы на іх выкананьне.

Мы, бязумоўна, будзем мець спробы «левакоў» палегчыць работу кулацтва—адміністраваньнем і прымусам замяніць масавую работу. Партарганізацыі павінны жорстка біць на такіх спробах падмяніць адміністраваньнем арганізацыю пад кіраўніцтвам партыі і ўлады шырокіх мас калгасьнікаў, бяднякоў і сераднякоў супроць кулацтва, на выкананьне плянаў веснавой кампаніі.

Ул. Я.

Калгасны сэктар вырас у паўтара раза

БЯЛЫНІЧЫ, (НАШ КАР.). ПАРТАРГАНІЗІЦЫЯ РАЁНУ ЗА АПОШНІЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ ДАБІЛАСЯ ЗНАЧНЫХ ПОСЬПЕХАЎ У АРГАНІЗАЦЫІ КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ. КАЛГАСНЫ СЭКТАР ВЫРАС У ПАЎТАРЫ РАЗЫ.

НА 1 ВЕРАСЬНЯ БЫЛО КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫХ ДВАРОЎ 9,7 ПРОЦ., А ЗАРАЗ УЖО ЁСЬЦЬ 15,5 ПРОЦ.

У ВЫНІКУ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ СПРАВАЗДАЧ ПЕРАД АДЗІНААСОБНІКАМІ У ЛАНЬКАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ АРГАНІЗАВАЛАСЯ 7 КАЛГАСАЎ. СЕЛЬСАВЕТ КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 33 ПРОЦ. БЯЛЫНІЦКІ, АЛЯКСАНДРАЎСКІ І ІНШЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ ТАКСАМА ЎЖО ЯДНАЮЦЬ АД 32 ДА 36 ПРОЦ. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ДВАРОЎ.

МЕЛЕХАЎ.

Калгас „Перамога“ агітуе паказам

РАСНА. (Пост «Зьвязды»). Агітуючы паказам, калгас **«Перамога»** ўключыўся ў барацьбу за свячасовую падрыхтоўку да другой бальшавіцкай сяўбы, **увязваючы яе з арганізацыяй калгаснага прыліву.** Калгасьнікі, арганізаваныя ў групы вярбоўшчыкаў, ужо дабіліся значных посьпехаў.

Колькасьць членаў калгасу «Перамога» павялічылася больш, як у чатыры разы. Дробны калгас «Перамога», які налічваў 9 гаспадарак, зараз налічвае 40 гаспадарак. Заявы паступаюць.

Новыя калгасьнікі абагулілі ўвесь інвэнтар і насеньне.

Калгас «Перамога» ўжо абмеркаваў плян сяўбы.

Хацкевіч.

Спадзяюцца на завоз насеньня

АСІПАВІЧЫ. Пляны веснавой кампаніі ў Асіпавіцкім раёне яшчэ не даведзены да сельсаветаў, не падрыхтаваны і не зацьверджаны кіруючымі раённымі ўстановамі.

Нічога ня робіцца ў галіне загатоўкі насеньня, асабліва тэхнічных культур.

Райкавсаюз спадзяецца на завоз насеньня тэхнічных культур з іншых месц і ня прымае мер для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Кантрольную лічбу НКЗ аб пашырэньні пасеўнай плошчы раёна прыняў з кажрала [illegible]. Рэальмер яравога кліну вымешаны [illegible]000 гэкт. у параўнаньні з кан[illegible]ай лічбай.

А. С.

2 новыя калгасы

ВАЛЫНЕЦ. (Па тэлеграфу). За апошнюю дзесяцідзённку ў Борквіцкім раёне арганізаваны два новыя калгасы, якія аб'ядналі больш двух дзесяткаў бядняцка-сераднякіх гаспадарак. У існуючыя калгасы ўступіла 20 гаспадарак.

У адказ на выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнай групы нацдэмаў беднякі і серадняк пасёлку Багданава аб'ядналіся ў калгас

Райком КП(б)Б
ВАШКЕВІЧ.

Пляны ня выйшлі з нетраў канцылярый

«СЕЛЬСАВЕТЫ НЯ МОГУЦЬ ЗАЙМАЦЦА ГЭТАЙ СПРАВАЙ»

На 10 сьнежня, паводле вестак раёнаў, **засыпана насенных фондаў у калгасах 183.367 цэнтн., страхавых фондаў—10.919 цэнтн.**

Паводле пастановы СНК, засыпка насенных фондаў павінна быць скончана да 1-га студзеня.

Полацкі РВК прыслаў у НКЗ адносіну, у якой піша, што «вестак няма па тэй прычыне, што зараз адбываюцца перавыбары саветаў і сельсаветы ня могуць займацца гэтай справай».

Наркамзем зусім ня мае вестак аб ходзе засыпкі насеньня тэхкультур. У зводках гэты момант не ад

СКРЫТЫЯ РЭСУРСЫ—У АКТЫЎ ПЯЦІГОДКІ

Ні аднэй не разгледжанай рабочай прапановы.—Ні аднэй лішняй тоны гатовай прадукцыі і поўфабрыкатаў на заводзкіх складах.—Ні аднаго лішняга варштату ў цэхах

Медна-ліцейны цэх гомельскага „Пралетара" і 2 цэхі віцебскай акулярнай датэрмінова перавыканалі прамфінплян

Правільнай арганізацыяй агляду, вытворчымі манэўрамі дабівайцеся такіх-жа посьпехаў

Ударнік заводу «Дрэваапрацоўшчык» т. Екельчык, які ўпёр каштоўную прапанову па сустрэчным прамфінпляне.

Вытворчыя манэўры—лепшы спосаб падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі

УСІМ ЦП САЮЗАЎ ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНУЦЬ ПРАВЕРАЧНЫЯ ДЗЕСЯЦІДНЕЎКІ

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб праверачных дзесяцідненьках (вытворчых манэўраў).

НОВАЯ ХВАЛЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ РАБОЧЫХ МАС У АДКАЗ ШКОДНІКАМ І ІНТЭРВЭНТАМ ЗНАЙШЛА СВАЁ ВЫЯЎЛЕНЬНЕ Ў БОЛЬШ ГЛЫБОКАЙ ПРАПРАЦОЎЦЫ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ, У ВЫЯЎЛЕНЬНІ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ І Ў БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

ПРАВЕРАЧНЫЯ ДЗЕСЯЦІДНЕЎКІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАКЛЮЧНЫМ ЗЬВЯНОМ У СКЛАДАНЬНІ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ, ГАРАНТУЮЧЫ АПОШНІ АД ПАМЯНШЭНЬНЯ, ЗАБЯСПЕЧВАЮЧЫ МАКСЫМАЛЬНУЮ МАБІЛІЗАЦЫЮ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ І ДАВЯДЗЕНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ САПРАЎДЫ ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА—ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЫМ З АСНОЎНЫХ МЭТАДАЎ РЭАЛІЗАЦЫІ АДОЗВЫ ЎСЕЦСПС АД 24-га ЛІСТАПАДА І АДНЫМ З ЛЕПШЫХ СПОСАБАЎ ПАДРЫХТОЎКІ СУСТРЭЧЫ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

КАНСТАТУЮЧЫ ЗНАЧНЫЯ ПОСЬПЕХІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН, ДАСЯГНУТЫЯ МНОГІМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ БССР Ў ВЫНІКУ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПРАВЕРАЧНЫХ ДЗЕСЯЦІДНЕВАК, ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ Ў ДАДАТАК ДА СВАЕЙ ПАСТАНОВЫ АД 2-га ЛІСТАПАДА 1930 ГОДУ ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. ПРАПАНАВАЦЬ ЦП САЮЗАЎ, РАЙПРАФСАВЕТАМ, ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНУЦЬ ПРАВЕРАЧНЫЯ ДЗЕСЯЦІДНЕЎКІ НА ЎСІХ ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. ГАЛОЎНАЯ ЎВАГА Ў ЧАСЕ ПРАВЕРАЧНЫХ ДЗЕСЯЦІДНЕВАК ПАВІННА БЫЦЬ СКАНЦЭНТРАВАНА НА МАБІЛІЗАЦЫЮ ЎСІХ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ.

2. СКЛАДАНЬНЕ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ ПАВІННА СКОНЧЫЦЦА ФАКТЫЧНА ПРАВЕРКАЙ ЯГО НА СПРАВЕ ЯШЧЭ ДА ПАЧАТКУ НОВАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ. ПРАПАНАВАЦЬ ЦП САЮЗАЎ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СВАЯЧАСОВАЕ ДАВЯДЗЕНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ 1931 ГОДУ ДА КОЖНАГА АГРЭГАТУ, ВАРШТАТУ І РАБОЧАГА ЯК У КОЛЬКАСНЫХ, ТАК І Ў ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ.

Вытворчыя манэўры на Жлобінскім вузлэ

Не дапускаць скажэньняў

Рабочыя і служачыя Жлобінскага вузла для выканаўньня ўсіх пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 10 верасьня г. г. і адозвы ЦК саюзу чыгуначнікаў ад 3 сьнежня абвясьцілі сябе мабілізаванымі і 15-га сьнежня пачалі вытворчыя манэўры на вузлэ. Для кіраўніцтва вытворчымі манэўрамі арганізован вузлавы штаб пры мясцкоме, арганізаваны штабы, пасты, разьведчыкі, брыгады. У першы дзень манэўраў на вузлавым сходзе рабочых і служачых аднадушна прынят і зацьверджан палітычны загад (?) вузлавога штабу, які выклікае ўсіх работнікаў мусіць выканаць і перавыканаць сустрэчны прамфінплян ударнага кварталу і да выйсьця спатканьня трэцяга году пяцігодкі.

Старшыня Райпрафсачу
КАТЛЯРОЎСКІ.
Сакратар парткалектыву
НІКАЛАЕЎ.
Начальнік раёну
СЬЦЯПАНАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: мы зьвяртаем увагу кіраўніцтва Жлобінскага вузла на скажэньне ідэі вытворчых манэўраў шляхам арганізацыі штабаў, «разьвядчыкаў», выданьня загадаў і г. д. У гэтай рабоце трэба абавязкова кіравацца матар'яламі, зьмешчанымі ў «Зьвязьдзе» і «Прафруху», у прыватнасьці артыкулам «Вытворчыя манэўры — неадпучная частка агляду» «Прафруху» № 32 ад 17 сьнежня.

100 добраахвотнікаў на Гомсельмашы

Першыя 45 рабочых прапаноў на гомельскай шчацінной фабрыцы

ГОМЕЛЬ. (НАШ КАР.). НА ГОМСЕЛЬМАШЫ 16 СЬНЕЖНЯ БЫЛО СКЛІКАНА ПА-ЗАЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ БЮРО РАЗАМ З ПРАФАКТЫВАМ І РАСПРАЦАВАНЫ ПЛЯНЫ ГОМСЕЛЬМАШЫ. АГЛЯД НАБЫВАЕ АСАБЛІВАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ Ў СУВЯЗІ З ВЯЛІЗАРНЫМ ПРАРЫВАМ.

У ПЕРШЫ-Ж ДЗЕНЬ ЗАПІСАЛАСЯ 100 ДОБРААХВОТНІКАЎ, ЯКІЯ РАЗБІЛІСЯ НА ПААСОБНЫЯ БРЫГАДЫ. СТВОРАНА СПЭЦЫЯЛЬНАЯ БРЫГАДА ПА БАРАЦЬБЕ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ.

СХОД РАБКОРАЎ АБАВЯЗАЎСЯ ВЕСЬЦІ РАШАЧУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ І ШТОДЗЕНА АСЬВЯТЛЯЦЬ ХОД АГЛЯДУ Ў «ЗЬВЯЗЬДЗЕ» І «ПРАФРУХУ». ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПАВІНЕН ВЫЙСЬЦІ СПЭЦЫЯЛЬНЫ НУМАР ШМАТТЫРАЖКІ, ПРЫСЬВЕЧАНЫ АГЛЯДУ.

На сёньняшні дзень амаль усе гомельскія прадпрыемствы ўключыліся ў агляд. На шчацінной фабрыцы 22 НОВЫХ РАБОЧЫХ УСТУПІЛІ ВА ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ. 6 СТАРЫХ РАБОЧЫХ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ ЖАДАНЬНІ ЎСТУПІЦЬ У ПАРТЫЮ. АБВЕШЧАН ЗБОР РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ. УЖО САБРАНА 45 РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ.

Б. З.

Уключаюцца ў агляд

(Па тэлефону і тэлеграфу)

Папяровая фабрыка «Прафінтэрн» уключылася ў генэральны агляд работы прадпрыемстваў па выкананьні прамфінплянаў, згодна праграмы «Зьвязды».

ЯЧЭЙКА КП(б)Б.

Мэблевая фабрыка імя Халтурына ў Marinowe уключылася ў агляд па праверцы выкананьня прамфінплянаў ударнага кварталу і падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі. Падрабязны шлях агляду высылаем сьнешнай поштай.

Сакратар ячэйкі КП(б)Б
ПЫЖЫКАЎ.

Магілеўскі машына - будаўнічы завод «Чырвоны адраджэнец» уключыўся ў генэральную праверку выкананьня прамфінплянаў.

ПАРТКАЛЕКТЫЎ.

Папяровая фабрыка «Спартак» (Шклоў) 17 сьнежня ўключылася ў генэральны агляд прамысловасьці.

ПАРТК

Гомельская група лесазаводаў «Калектыўная праца» і «Сацыялізм» уключыліся ў агляд. Плян агляду будзе дадаткова дасланы.

Парткалектыў БАС.
Заўком ЛЕВІН.
Заводакіраўніцтва КАРАТКЕВІЧ.

Гарбарня - галянтарэйная фабрыка «Усход» (Менск) уключылася ў генэральны агляд выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу. Вылучана брыгада. Складзены плян на падставе праграмы «Зьвязды». Праведзены агульныя сходы рабочых цэхаў. Складзены цэхавыя брыгады, якія выпрацоўваюць свае пляны і прыступаюць да праверкі.

М. І.

Віцебскі завод «Камінтэрн» 15-га сьнежня ўключыўся ў агляд. Складзена брыгада. Усе пункты праграмы агляду прынятыя. Арганізавана круглосутачнае [illegible]

590 тон паперы

НЕ ДАДАНА ДЗЯРЖАВЕ

Рабочыя прапановы—пад сукном

Паперовая фабрыка «Спартак» (Шклоў) за першыя 2 месяцы ўдарнага кварталу недавыканала прамфінплян на 20 проц. 500 тон паперы не дадана дзяржаве за ўдарны квартал.

У канцы кастрычніка на фабрыцы праводзіліся вытворчыя манэўры. Не гледзячы на гата, прамфінплян, нават у часе манэўраў, выконваўся толькі ў разьмеры 85 проц.

Праўда, паасобныя лепшыя брыгады, зьмены ў часе манэўраў нават перавыконвалі прамфінплян. Былі дні, калі і ўся фабрыка выконвала заданьне на 100 проц. Але трыкутнік ня здолеў замацаваць дасягнутыя посьпехі, ня здолеў арганізаваць рабочых на змаганьне за бальшавіцкія тэмпы.

Адміністрацыйна - тэхнічныя непаладні, безадказнасьць, адсутнасьць адзінаначальня—вось асноўныя прычыны, якія прывялі да таго, што фабрыка зараз ганебна адстае.

Прастой за ўдарны квартал дасягаюць 12 проц., замест прадугледжаных плянам 6 проц. Нераспарадчасьць адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу — галоўная прычына прастояў. Так, папрыклад, у лістападзе, у дні Кастрычніцкіх сьвят, быў зроблены рамонт усіх машын. Але на другі-ж дзень замест 6 гадзін раніцы большасьць цэхаў была пушчана толькі а 8 гадз. вечара. Цэлы дзень прастой. У чым справа? Аказваецца, што маторы былі не ў парадку. Адна з машын прастаяла 7 гадзін з прычыны таго, што адміністрацыя не паклапацілася своячасова паведаміць рабочага, каб ён выйшаў замест захваравўшага таварыша.

Усе гэтыя непаладкі выклікаюцца тым, што паміж адміністрацыйна-тэхнічнымі работнікамі не разьмеркаваны функцыі. Загадчык папяровым аддзелам — Івашнёў, загадчык вытворчасьцю—Бошняк і яго намесьнік — Шнэйдэрман безадказна адносяцца да сваіх абавязкаў.

Прапановы рабочых аб паляпшэньні вытворчасьці ўжо не адзін месяц пяжаць пад сукном і не ажыцьцяўляюцца. Нават тыя прапановы, якія прэміяваны, таксама не праводзяцца ў жыцьцё.

Грамадзкія арганізацыі фабрыкі вельмі слаба рэагуюць на вышэй паданыя факты. Брыгады «лёгкай кавалерыі» перадалі бюро парткалектыву падрабязныя выказы аб балячках на фабрыцы. Бюро-ж абмежавалася тым, што перадала ўвесь гэты матар'ял РСІ. Ні заўком, ні парткалектыў не мабілізавалі ўвагі рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу вакол непаладак.

Пчолкін.

„Дробязі",

якія пагражалі спыненьнем зав. „Чырзоны Кастрычнік"

ПРАПАНОВЫ РАБОЧЫХ—ВЫЦЯГНУЦЬ З ПАПАК!

Дротава-цьвіковы завод «Чырвоны кастрычнік» (Аршанскі раён) за першую дэкаду сьнежня выканаў свой прамфінплян з перавышэньнем — на 103,5 проц. Нават тыя цэхі, якія раней адставалі, таксама значна перавыканалі прамфінплян. Так, цэх навоцкі пашлёк выканаў прамфінплян у разьмеры 123,1 проц. цэх тэксамашын—105,3 проц.

Але гэта перавыкананьне яшчэ не пакрывае тых прарываў, якія мелі месца на заводзе ў лістападзе. Галоўнай прычынай іх — нікуды нявартае ўнутры заводзкае плянаваньне.

У лістападзе раптам схамянуліся, што на заводзе не хапае серкавай кіслаты. А бяз серкавай кіслаты нельга вырабляць дроту, заводу пагражала спыненьне.

Дырэктар ламаў сабе галаву, дзе-б дастаць хаця-б пару балёнаў кіслаты. Пасылалі тэлеграмы ва ўсе канцы СССР, званілі па тэлефону ў адпаведныя ўстановы, а кіслаты няма. Завод ужо спыняў сваю работу, па заўтра ўжо ня было чым працаваць.

І вось у самы крытычны момант майстар дротава - цьвіковага цэху т. Азаронак у адным з заводзкіх хлявоў знайшоў 200 балёнаў серкавай кіслаты.

Заводу пагражала спыненьне з-за нястачы кіслаты ў той час, калі апошняя знаходзілася тут-жа і ніхто аб ёй ня ведаў, а можа і ведаў, але наўмысьля ўтойваў.

Варштаты зноў запрацавалі яшчэ шпарчэй, чым раней.

Не прашло і некалькі дзён, як схамянуліся, што на заводзе няма вугалю. Цэхі скарацілі вытворчасьць.

Гэтыя два факты гавораць аб тым, што забясьпечваючы аддзел на заводзе працуе зусім дрэнна, няма ніякай адказнасьці за бесьперабойную работу прадпрыемства. Гэтыя факты сьведчаць, што на радзе нашых прадпрыемстваў недаацэньваюць справы мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Ня лепш справа і з прапановамі рабочых і вынаходцаў. Заводакіраўніцтва не зварачае на іх ніякай увагі. У часе месячніка па барацьбе са стратамі рабочымі было выкінута шмат каштоўных прапаноў, але ўсе яны пляжаць пад сукном, ні адна з іх не праведзена ў жыцьцё.

Прапановы рабочых-вынаходцаў адміністрацыя заслухоўвае, але не дапамагае ім арабіць мадэлі. Напрыклад, некалькі рабочых вынайшлі машынку па сартаваньні машыннага тэксу, але ўжо вось каля 2-х год ніяк ня могуць зрабіць мадэлі гэтай машынкі.

Нядаўна машыніст Корбан вынайшаў выпарвальнік, які аказаўся лепш існаваўшага раней. Але гэту прапанову пераканаў майстар Вэндзілоўскі і падаў яе за сваю. Вэндзілоўскі атрымаў прэмію ў 150 руб. Калі тав. Корбан паставіў аб гэтым пытаньне ў ячэйцы і заўкоме, яму выдалі 50 руб. Прэмія-ж, выданая Вэндзілаўскаму, так і засталася ў яго. Хто-ж зьяўляецца вынаходцам — [illegible] і засталося [illegible]

ШЫЦІК.
ЯФРЭМЕНКА.

У бой

ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ РЭЗЭРВЫ

Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці мае вялікае значэньне для пасьпяховай барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Аднэй з важнейшых задач пачатага па БССР генэральнага агляду прамысловасьці зьяўляецца выяўленьне скрытых рэзэрваў, пішкаў матар'яляў, поўфабрыкатаў, пішкаў рабочае сілы.

На многіх нашых прадпрыемствах ня ўлічваюць значэньня мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Мы маем факты, калі з-за недахвату таго або іншага матар'ялу некаторыя прадпрыемствы знаходзяцца пад пагрозай спыненьня. Між тым на другім суседнім прадпрыемстве ёсьць значныя лішні запасаў гэтых матар'ялаў.

У той час, калі на многія вырабы ёсьць вялікі попыт, мы маем факты скапленьня на прадпрыемствах вялікіх запасаў гатовай прадукцыі.

Так, у Віцебску нядаўна быў зроблены налёт на прадпрыемствы. У часе налёту НА ФАБРЫКАХ ВІТШВЭЮ ВЫЯЎЛЕНА НА 500.000 РУБ. ЛІШНІХ ЗАПАСАЎ СЫРЦУ І ПАЎФАБРЫКАТАЎ.

На сьпіртавым заводзе выяўлена НА 30.000 РУБ. гатовага дэнатурату.

Цікавым прыкладам можа быць і наступны факт. На гуце «КАСТРЫЧНІК» у Сьвіслацкім раёне выяўлены вялікія запасы пямпавага шкла. Між тым, у вясковых крамах побач з заводам гэтага шкла няма.

У ВІЦЕБСКУ на многіх прадпрыемствах не хапае апалу. Між тым, НА ЛЕСАЗАВОДЗЕ № 13 скапіліся вялізарныя запасы абрэзкаў, якія могуць замяніць дровы. На заводах прамтэсту накапілася КАЛЯ 1.500 ВАГОНАЎ АБРЭЗКАЎ, а на заводзе ПАПРАЎЧАГА ДОМУ—каля 500 ВАГОНАЎ.

Вышэйпаданыя факты гавораць аб нескарыстаных рэзэрвах, якія захаваны яшчэ ў нашай прамысловасьці. На выяўленьне гэтых рэзэрваў, безадкладнае скарыстаньне іх павінна зараз быць накіравана ўвага нашай заводзкай грамадзкасьці, рабкораў, заводзкага друку.

6.000 руб. эканоміі

ДАЕ ПРАПАНОВА КАЧАГАРА Ф-КІ ІМЯ ВАРОЎСКАГА,

а адміністрацыя ўпарта ня хоча яе разгледзець

Адміністрацыя картоннай фабрыкі імя Вароўскага (Сураскі раён) вельмі няўважліва адносіцца да рабочых прапаноў. Нядаўна рабочы-качагар унёс прапанову аб скарыстаньні тэмпэратуры адыходзячых газаў, якая дасягае 280 градусаў па Цэльсію. Ажыцьцяўленьне гэтай прапановы дало-б фабрыцы эканоміі апалу на 6.000 руб. у год. Ня гледзячы на відавочную каштоўнасьць гэтай прапановы, адміністрацыя не разглядае яе.

Нават прэміяваная прапанова аб скарыстаньні адыходзячай пары ў сушні таксама не праводзіцца ў жыцьцё. Такія выпадкі не адзінкавыя.

Нячулыя адносіны адміністрацыі да рабочых прапаноў прывялі да таго, што прыцёк рабочых прапаноў за апошні час намоцнуўся.

ШЫЦІК.
ЯФРЭМЕНКА.

На дзесяткі тысяч рублёў

ГАТОВАЙ ПРАДУКЦЫІ ЗАТРЫМЛІВАЕ БЕЛСКУРСНАБ НА РЫМАРНАЙ ФАБРЫЦЫ

Да 25 верасьня магілеўская рымарна-сядзельная фабрыка выконвала прамфінплян з перавышэньнем. Але, пачынаючы з апошніх лічбаў верасьня і на працягу кастрычніка і лістапада фабрыка сыстэматычна ня выконвае прамфінпляну, з прычыны ненармальнага забесьпячэньня матар'ялам.

«Союзкож» зацьвердзіў заяўку фабрыкі у 90 тон сыраміці, але адпусьціў толькі 40. У выніку плян за кастрычнік быў нявыкананы на 30 проц. За прастой было выплачана рабочым звыш 9.000 руб.

Аднэй з прычын невыкананьня фабрыкай прамфінпляну зьяўляецца вельмі нявыразная работа «Союзкож», які няправільна разьмяркоўвае матар'ялы — адным завозіць больш, чым трэба, а другім не дадае. У выніку і прарывы.

Рабочыя фабрыкі супольна з адміністрацыяй страцілі ўсякія надзеі на «Союзкож» і самі арганізавалі цэх па выпрацоўцы сырцу. 15 лістапада закладзі першую партыю. 20-га сьнежня фабрыка ўжо будзе мець 2.000 кгр. сырцу ў дзень, якія поўнасьцю забясьпечаць закройнае аддзяленьне.

Ня лепш справа і з хамутным аддзяленьнем, якое ўвесь год адчувала недахват клешчаў. Але з моманту арганізацыі Белскурснабу нястача яшчэ больш павялічылася. Белскурснаб заяўку фабрыкі на клешчы прыняў, але ня выконвае яе. Такім чынам, фабрыка на асобны ўдарны квартал зусім засталася бяз клешчаў. Старшыня Белскурснабу абяцаў забясьпечыць фабрыку з 1-га сьнежня, а 19 лістапада заявіў, што толькі з 1-га студзеня магчыма будзе забясьпечыць фабрыку клешчамі. Як выяўляецца зараз, забясьпячэньне фабрыкі клешчамі ў 1931 годзе знаходзіцца яшчэ над вялікім сумненьнем. Такую рэч, як клешчы, бязумоўна, можна было-б ня прывозіць з Масквы, а паладзіць іх выраб у нас, у БССР. У выніку фабрыка ў асобным квартале замест 445 хамутоў у дзень — выпускае толькі 100-115.

Прэзыдыум ЦП саюзу гарбароў замест таго, каб ужыць рашучыя крокі для бесьперабойнага забясьпячэньня фабрыкі клешчамі, пашоў на лінію найменшага супраціўленьня. Каб ліквідаваць прастой на фабрыцы, ён запрапанаваў павялічыць выпуск сёдлаў. Зараз на і хамут прыпадае на 5-6 сёдлаў.

Каб выпускаць поўны камплект хамутоў і сёдлаў, рабочыя зьвярнуліся да Белскурснабу з прапановай арганізаваць выраб клешчаў у Магілеве, але Белскурснаб фактычна канкрэтнага адказу на гэты ліст ня даў.

«Союзкож» мае шмат нарадаў на тэрміновую адгрузку рымарнай прадукцыі ў пераазгатоўчыя раёны. Але Белскурснаб ўпляваньне затрымлівае на складах фабрыкі гатовую прадукцыю на дзесяткі тысяч рублёў.

П—ка.

Скончыць праграму 28 сьнежня

Гарбарня «БАЛЬШАВІК» 17 сьнежня ўключылася ў агляд. Распрацаваны падрабязныя пляны як па ўсім заводзе, так і па паасобных цэхах. Трыкутнік заводу зьвярнуўся да ўсіх рабочых, работніц і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу заводу з адозвай, у якой ставіць перад калектывам задачу скончыць праграму ўдарнага кварталу 28-га сьнежня.

Чухаемец рабочы т. Тыфэнбахэр, які [illegible] Ужо саванцкім механічным заводзе, арабіў каштоўнае вынаходніцтва. На [illegible] тав. Тыфэнбахэр са-

Ударнік заводу «Дрэваапрацоўшчык» т. Гольпер—аутар вытворчых прапаноў па сустрэчным прамфінпляне

НА 12 ДЗЁН РАНЕЙ ТЭРМІНУ

ГОМЕЛЬ, 18. (Па тэлефону ад наш. кар.). Сёньня мядзяна-ліцейны цэх заводу „Пралетары" поўнасьцю скончыў праграму ўдарнага кварталу. Выканана заданьне ў 140 тон мядзянага ліцьця. Прадукцыйнасьць працы на кожнага рабочага павялічылася да 30 клгр. у дзень, замест 23 у мінулым годзе і 26 паводле заданьня на ўдарны квартал. Адначасова вырасла зарплата рабочых: замест 3 р. 91 к. у сярэднім да 4 руб. 52 кап. За ўвесь ударны квартал у мядзяна-ліцейным цэху было ўсяго 9 прагулаў.

Усе цэхі заводу скончаць выкананьне праграмы не пазьней 25-га сьнежня.

У сьнежні ліквідавалі прарыў

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону ад наш. спэц. кар.). Два цэхі акулярнай фабрыкі—цэлюлёідны і фітцу (пэнснэ) учора скончылі выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу. Пры захаваньні цяперашніх тэмпаў работы фабрыка прыблізна 29-га сьнежня скончыць выкананьне ўсяго прамфінпляну ўдарнага кварталу і ліквідуе запазычанасьць другога году пяцігодкі ў разьмеры аднаго процанту.

Гэтыя посьпехі фабрыка мае, ня гледзячы на тое, што ў настрычніку яна выканала праграму на 89 проц. і ў лістападзе—на 80 проц. Затое, за першую дэкаду сьнежня фабрыка выканала праграму на 112 проц., а за трэцюю пяцідненьку—на 124 проц.

ПРЫКЛАД ДЛЯ ЎСІХ ЧЫГУНАЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Магілеўскі вузел першы адгукнуўся на заклік „Зьвязды"

МАГІЛЕЎ (ПА ТЭЛЕГРАФУ). Пастановай бюро партыйнага калектыву вузлавога трыкутніка і пашыранага пасяджэньня мясцкомаў, МАГІЛЕЎСКІ ВУЗЕЛ уключаецца ў агляд прадпрыемстваў, арганізаваны «Зьвяздой». 17 сьнежня правялі цэхавыя мітынгі. 18 праводзім вузлавы мітынг. Ствараем брыгады па самаправерцы. Праводзім суботнікі для ліквідацыі прарываў. Высылаем плян.

ТРЫКУТНІК

Непаладкі ў цэхах

вывялі завод „Камунар" з першай шарэнгі змагароў за прамфінплян

Адміністрацыя ня здолела замацаваць посьпехі

Завод «Камунар» скончыў вытворчую праграму другога году пяцігодкі з перавышэньнем як колькасных, так і якасных паказальнікаў (102,09 проц.). Першыя два месяцы ўдарнага кварталу завод таксама перавыконваў заданьне—ў кастрычніку 101,3 проц. і ў лістападзе — 100,09 проц. Камунараўцы выйшлі ў першыя рады змагароў за прамфінплян, за пераходныя сьцягі імя ЦК КП(б)Б. ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ.

Але работа заводу за 14 дзён апошняга і рашаючага месяцу ўдарнага кварталу выявіла камунараўцаў з першых радоў. Так, па сьвідравальных варштатах заданьне выканана ў разьмеры 61,8 проц., па варштатах «Сьмірнова» ў разьмеры 63, 5 проц. Па бляшаным цэху праграма нявыканана на 31 проц., у ліцейным цэху замест 96 тон адліта толькі 89. Па ванасных частках да камнядрабілак праграма выканана на 80 проц.

У ліцейным цэху з-за нераспарадчасьці майстраў і адміністрацыі за апошні час значна павялічыўся брак. З прычыны дрэннай арганізацыі працы ў фармоўшчыкаў меў месца прастой. Фармоўшчыкам шмат часу зранку прыходзіцца траціць на тое, каб знайсьці апоку, бо прыбіральнікі раскідаюць іх па розных кутках. Бываюць выпадкі, калі рабочыя, ня скончыўшы аднэй работы, бяруцца за другую.

У навальскім цэху 20 чалавек, якія працуюць па зборцы, часта ня маюць нагрузкі. При распальваньні нафтавай печы едкі густы дым засьцілае ўвесь кавальскі цэх. Зразумела, у такой абстаноўцы рабочыя працуюць з меншай прадукцыйнасьцю, між тым, калі распальваць печ можна было-б да пачатку работы.

У бляшаным цэху невыкананьне прамфінпляну тлумачыцца нераспарадчасьцю адміністрацыі і наогул зьніжэньнем тэмпаў работы.

Вытворчаму сэктару пасьля скончэньня манэўраў было даручана сачыць за штодзённай выпрацоўкай заводу, але сэктар праспаў. Схамянуліся, калі ўжо прайшло 14 дзён.

Прыкладам для іншых зьяўляецца брыгада па зборцы камнядрабілак, якая працуе сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі. За 14 дзён, брыгада сабрала 55 камнядрабілак, замест вызначаных 34-х. Гэта ў той час, калі раней гэта брыгада толькі з 15 кожнага месяца выпускала гатовыя камнядрабілкі. Брыгада па кувырках абавязалася ў гэтым месяцы замест 20 выпусьціць 25 кувыркаў.

Такія тэмпы работы павінны зараз быць у кожнай брыгадзе, вытворчай камуне і ў кожнага ўдарніка. Зараз, як ніколі, брыгада аднаго цэху павінна ўзяць на буксір і дапамагаць брыгадам другога.

Камунараўцы павінны зноў заняць ранейшае месца ў першай шарэнзе змагароў за прамфінплян.

А. Маркаў.

Рабкоры Віцебска, Гомеля і Менску, прымайце выклік рабкораў „Дзьвіны"

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону ад наш. кар.). Сход рабкораў фабрыкі „Дзьвіна" пастанавіў выпусьціць лістоўку, прысьвечаную агляду, і дзьве шматтыражкі. Вылучаны цэхавыя і агульнафабрычны пасты „Зьвязды". Вызначаны дзяжурныя рабкоры па ўсіх цэхах на кожны дзень.

Сход рабкораў выклікаў на сацспаборніцтва па лепшым асьвятленьні агляду і большую дапамогу мясцовым арганізацыям рабкораў Віцебска, Гомеля і Менску.

Антырэлігійная работа--

ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО САЦНАСТУПЛЕНЬНЯ

НЕ ПА-КАМПАНЕИСКУ, А СЫСТЭМАТЫЧНА ВЕСЬЦІ, ЗМАГАНЬНЕ СА ЗБРОЯЙ КЛАСАВАГА ВОРАГА—РЭЛІГІЯ. НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ АНТЫКАЛЯДНУЮ КАМПАНІЮ. НІ АДНАГО ПРАГУЛУ Ў ЧАС КАЛЯД. СТВОРЫМ НОВЫЯ СОТНІ ШКОЛ, ЛІКПУНКТАЎ, УДАРНЫХ БРЫГАД, ПАВЯЛІЧЫМ СВОІ УДЗЕЛ У САЦБУДАЎНІЦТВЕ

Па-бальшавіцку змагацца з апартуністамі, якія недаацэньваюць палітычнага значэньня антырэлігійнай работы

XVI партыйны зьезд у сваёй пастанове па дакладу т. Шверніка адзначыў, што неабходна **«правільна арганізаваць і ўзмацніць антырэлігійную прапаганду»**. Гэта ўстаноўка абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі паставіць у цэнтры ўвагі антырэлігійную работу.

Эканамічны крызіс у капіталістычных краінах, які ў радзе краін перарастае ў палітычны, рост рэвалюцыйнага рабочага руху, рост і ўзмацненьне брацкіх камуністычных партый, рост супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі краінамі ў барацьбе за рынкі збыту, а аднаго боку і, з другога — пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР, выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, ліквідацыя на базе суцэльнай калектывізацыі апошняй цьвярдыні капіталізму ў нашай краіне — кулацтва як клясы—усё гэта прыводзіць у шаленства нашых як унутраных, так і зьнешніх клясавых ворагаў.

Мы зьяўляемся сьведкамі, як міжнародная буржуазія рыхтуе новую сусьветную бойню супроць Савецкага Саюзу. Працэс «прамацтрыі», выкрытая і арыштаваная група контр-рэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў—гэтых агентаў польскага фашызму—паказалі в усёй выразнасьцю, як сусьветная буржуазія ў саюзе з клясавымі ворагамі ўнутры Савецкай краіны скарыстоўвае ўсе магчымасьці, для таго, каб перашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, для таго, каб зьнішчыць сацыялістычную бацькаўчыну працоўных усяго сьвету — СССР.

Царква і яе агенты — клір усіх масьцей грацюць магутную ролю ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу. Як унутры краіны, так і ў сусьветным маштабе яны скарыстоўваюць усё для таго, каб сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, яны ўсімі сіламі дапамагаюць сусьветнай буржуазіі ў ажыцьцяўленьні яе інтэрвэнцыйных плянаў.

Даволі прыпомніць такія факты, як «крыжовы паход» супроць СССР, арганізаваны рымскім папаю, выступленьне супроць СССР архіепіскапа Кентэрбурыйскага ў Англіі, апошняе выступленьне папы Пія XI, у якім ён заяўляе: **«ясьцерагайцеся, каб бальшавікі не распаўсюдзіліся ў Амэрыцы ў момант фінансавай дэпрэсіі і беспрацоўя»**. Усё гэта зьяўляецца зьвеньнямі ў агульным ланцугу падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу. У зьвязку з абвастрэньнем клясавага змаганьня ўнутры СССР, мы таксама назіраем актывізацыю клясава-варожых элемэнтаў, якія скарыстоўваюць рэлігію ў сваіх контрэвалюцыйных мэтах. Мы зьдзіўляліся сьведкамі контр-рэвалюцыйнай шпіёнскай работы каталіцкага кліру, а таксама раду рэлігійных сэктанцкіх арганізацый у ВССР, а таксама і ў іншых рэспубліках Савецкага Саюзу, якія па заданьні генэральных штабаў капіталістычных краін праводзілі контр-рэвалюцыйную шпіёнскую работу ў Савецкім Саюзе. Мы маем рад фактаў, калі рэгіянальныя рэлігійныя і сэктанцкія арганізацыі праводзілі арганізацыйную і палітычную работу па падрыхтоўцы да зьвяржэньня савецкай улады. Яскравым прыкладам можа быць працэс Фёдараўцаў, які з усёй паўнатой паказаў, як контр-рэвалюцыянэры, апранутыя ў рэлігійную вопратку скарыстоўвалі ўсё для таго, каб распаўсюдзіць свой уплыў на працоўныя масы, каб сарваць сацыялістычнае будаўніцтва. Яны павят дайшлі да таго, што ў сваёй рабоце падрыхтавалі склад чорнасоценнага ўраду, які-б аднавіў усе «прелести» царскага ўраду.

Актывізацыя рэлігійных аб'яднаньняў вымагае ад нас больш, як ніколі узмацніць антырэлігійную работу, узмацніць і пашырыць работу саюзу валяўічых бязбожнікаў.

У падыходзячае сьвята каляд клясавы вораг таксама будзе скарыстоўваць усе магчымасьці, каб задурманіць мазгі працоўных рэлігійным дурманам, а тым, каб адцягнуць працоўных ад сацыялістычнага будаўніцтва, каб падарваць магутнасьць Савецкага Саюзу.

Мы павінны в свайго боку ўзмацніць работу па далейшым выкрыцьці контр-рэвалюцыйнай сутнасьці рэлігіі, паказаўючы яе клясава-варожы зьмест.

Антыкалядная кампанія ў гэтым годзе супадае з дзьвюма гістарычнымі падзеямі: **з 25-годзьдзем сьнежаньскага паўстаньня 1905 г. і з пачаткам трэцяга году пяцігодкі.** Абедзьве гэтыя даты заклікаюць рабочых і сялян да барацьбы за канчатковую перамогу сацыялізму, за канчатковае зьнішчэньне карэннямі капіталізму, а значыцца і да барацьбы супроць рэлігіі —найбольш небясьпечнай зброі капіталу. У першую рэвалюцыю 1905 г. рэлігія адыграла ў адносінах да працоўных мас катаўскую ды правакатарскую ролю (Гапаньяда). Першая дата, якая супадае з каляднымі днямі г. г., напамінае аб варожых адносінах рэлігіі да сацыялізму.

Але і зараз в усёй выразнасьцю ў штодзённым жыцьці выяўляецца варожасьць рэлігіі да будаўніцтва сацыялізму. Трэці год пяцігодкі высоўвае цэлы рад гаспадарчых і палітычных задач. Ён зьяўляецца рашаючым годам у выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, а значыць і ў будаўніцтве сацыялізму. Мы павінны ўвязаць нашу антырэлігійную работу з папулярызацыяй задач, што стаяць перад трэцім годам пяцігодкі, з папулярызацыяй задач далейшага будаўніцтва, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместе культуры.

Трэба дабіцца ў часе антыкалядняй работы **ўцягненьня ў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва новых соцень тысяч рабочых, уцягненьня ў СВБ, як мага больш шырокіх колаў працоўнага насельніцтва.** Антырэлігійная работа павінна быць цесна ўвязана з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, яна павінна зьяўляцца неадлучнай часткай усяе нашае работы. Трэба завастрыць увагу на ўзмацненьні працоўнае дысцыпліны, трэба **дабіцца такога становішча, каб у часе каляд ня было ніводнага гарагулу.** Ячэйкі СВБ павінны разгарнуць шырокую работу па ліквідацыі няпісьменнасьці, шырока растлумачваючы перад масамі працоўных задачы культурнай рэвалюцыі, як неадлучнай часткі ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва, ужываючы ўсе меры да таго, каб забясьпечыць ажыцьцяўленьне асноўнага зьвяна культурнае рэвалюцыі —усеагульнага абавязковага навучаньня.

Антыкалядную кампанію трэба шырока ўвязаць з перавыбарамі саветаў, якія зараз праводзяцца па ўсёй БССР. Для саюзу валяўічых бязбожнікаў кампанія па перавыбарах саветаў павінна зьвяцца **вялізарнейшым палітычным экзэмэнам у справе далейшага ўцягненьня шырокіх колаў працоўных СВБ у далейшую работу па сацыялістычным будаўніцтве.** Ячэйкі СВБ павінны прыняць актыўнейшы ўдзел у гэтай кампаніі, выкрываючы перад шырокімі масамі кулацкіх шкодную дзейнасьць рэлігійных арганізацый і клясавую сутнасьць рэлігіі. Яны павінны, дапамагаючы партыйным арганізацыям, выкрываць і ачышчаць сельсаветы ад кулакоў, падкулачнікаў—ад агентуры клясавага ворага.

Антырэлігійная работа павінна стаць неадлучнай часткай усёй работы кожнай ячэйкі, кожнага камітэту партыі. Яна павінна весьціся сыстэматычна і ў плянавым парадку. Трэба дабіць рашучы адпор апартуністычнай недаацэнцы работы на антырэлігійным фронце. Лазунг—ніводнага калгасу, саўгасу, школы, прадпрыемства без ячэйкі СВБ — павінен стаць баявой праграмай дзеяньня кожнай партыйнай ячэйкі. Трэба дабіцца таго, каб ячэйкі сыстэматычна выхоўвалі новыя кадры бязбожніцкага актыву, каб усю масу бязбожнікаў яны поўнасьцю ўцягвалі праз ударніцтва і сацыянаборніцтва на ўсе галіны сацыялістычнага будаўніцтва.

Антыкалядная кампанія г. г. павінна прайсьці пад знакам рашучага выкрыцьця і барацьбы з правым ухілам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай. «левымі» загібамі, супроць права - «лявацкага» блёку і прымірэнчых адносін да ўхілаў ад лініі партыі. Прыцягваючы шырокія колы працоўных да работы па актыўным удзеле ў сацыялістычным будаўніцтве, праводзячы інтэрнацыянальнае выхаваньне сярод працоўных мас, упарта будуючы нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместе культуру, змагаючыся з ухіламі ад нацыянальнай палітыкі партыі, сыстэматычна праводзячы антырэлігійную работу, мы яшчэ больш энэргічна будзем весьці барацьбу з клясавымі ворагамі і зьнішчаць іх найбольш небясьпечную зброю — рэлігійны дурман, які яшчэ мае ў пэўнай меры ўплыў на адсталыя пласты працоўных мас.

3.

МЕНСК



Менск будуецца. На вуліцы імя К. Маркса вырастае новая тэлефонная станцыя

Каляндарны плян справаздачных сходаў гарсавету

Гарадзкая выбарчая камісія зацьвердзіла каляндарны плян справаздачных сходаў гарсавету. Сходы будуць праводзіцца з 1-га па 19-га студзеня. Горад разьбіты на 206 справаздачных вучасткаў. У першую чаргу справаздачныя сходы адбудуцца на буйных фабрыках і заводах. Перавыбарчыя сходы гарсавету мяркуецца правесьці з 20 студзеня па 10 лютага.

Ліквідацыя таварных залежаў на станцыях чыгункі

СНК БССР пастанавіў арганізаваць цэнтральную камісію а прадстаўнікоў НК РСІ, Наркамгандлю, ВСНГБ і Белкаапсаюзу па ліквідацыі залежаў тавараў на складах і ў пакгаўзах чыгункі. Камісія павінна ў дэкадны тэрмін вывявіць разьмер таварных залежаў і пераладзіць апошнія для рэалізацыі сыстэме спажывецкай кааперацыі.

Такія-ж камісіі будуць складзены ва ўсіх раёнах, дзе ёсьць чыгуначныя станцыі.

Заўкомы „Энэргіі" і „Камунара" сарвалі справаздачны сход гарсавету

11 сьнежня на сходзе рабочых заводаў «Энэргія» і «Камунар» парінна была адбыцца справаздача адміністрацыйна - прававой сэкцыі Менгарсавету.

Аднак сход быў сарваны з-за нядбайнасьці заўкомаў гэтых заводаў, якія не правялі ніякай растлумачальнай работы сярод рабочых аб значэньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі. У выніку **на сход не зьявіўся ні адзін рабочы.**

Мы літым такія адносіны з боку заўкомаў заводаў «Энэргія» і «Камунар» да справаздачна - перавыбарчай кампаніі зусім недапушчальнымі.

Новы парадак выдачы тавараў

15-га сьнежня адбылася нарада прадстаўнікоў Белкаапсаюзу, МЦРК з удзелам упаўнаважанага Цэнтрасаюзу СССР, на якой абгаварвалася пытаньне аб ліквідацыі залежаў тавараў у МЦРК і аб хутчэйшай рэалізацыі таварнай прадукцыі.

Нарада пастанавіла з 21-га сьнежня выпусьціць у продаж па адкрытых крамах усю нерэалізаваную гатовую вопратку і адпускаць яе па паявых кніжках з адпаведнай адзнакай.

Да 20-га сьнежня гатовая вопратка адпускаецца па авансаваных і неавансаваных талёнах. Новыя партыі гатовай вопраткі выпускаюцца ў продаж праз закрытыя разьмеркавальнікі па талёнах, непраданыя да 25-га сьнежня партыі тавару таксаму перадаюцца ў адкрытыя крамы.

Фонд дзіцячай вопраткі для школьнікаў разбраніруецца; дзіцячая вопратка будзе прадавацца па паявых кніжках, але пайшчым павінен прадставіць таксама і дакумант са школы.

З 21-га сьнежня выпускаюцца ў агульны продаж наяўныя фонды скурабутку. Выдаваецца ён будзе па паявых кніжках. Новыя партыі абутку вырабу мясцовых фабрык прадаюцца да 25-га сьнежня ў закрытых разьмеркавальніках, пасьля чаго перадаюцца ў адкрытыя крамы.

Недэфіцытныя галянтарэйныя тавары выдаюцца ўсім спажыўцам без абмежаваньня. Панчохі і шкарпэткі выпускаюцца ў продаж па паявых кніжках. Барысаўскі ЦРК павінен перадаць менскаму цэрабкопу панчох і шкарпэтак на 26.000 руб.

Нітки будуць прадавацца выходзячы з нормы па адной шпульцы на едака. Цукеркі будуць прадавацца ўсяму насельніцтву бяз усякіх абмежаваньняў.

Да 25-га сьнежня павінна быць скончана выдача папярос на сьнежань 1930 году і студзень 1931 году ў межах устаноўленых норм. Папяросы 4-га гатунку выпускаюцца ў вольны продаж у межах норм асабістага спажываньня. Махорка выдаецца асобным катэгорыям у сьнежні за студзень.

Крупы, макароны, рыс выдаюцца па нормах адпаведным групам пайшчыкаў з тым, каб да 1-га студзеня ня было ніякіх рэштак. У другой палове сьнежня выпускаецца ў продаж дзіцячы паёк за студзень месяц.

Ад рэдакцыі „Партработніка"

У нумары 16 часопісі «Партыйны Работнік» дапушчаны наступныя апячатні.

У другім абзацы перадавога артыкулу надрукавана:—«Было-б немагчыма бяз зьніжэньня трацкісцкай апазыцыі», траба—«было-б немагчыма БЯЗ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ТРАЦКІСЦКАЙ АПАЗЫЦЫІ».

Там-жа на 3-й старонцы надрукавана: «Даурушынкам няма месца ў партыі. Марэцкі, Стэцкі з партыі выключаны». Трэба—«МАРЭЦКІ, СЬЛЯПКОЎ З ПАРТЫІ ВЫКЛЮЧАНЫ».

Рэдкалегія.

Паведамленьні

— Дакладчыкамі па пытаньні юбілею рэвалюцыі 1905 году па Фрунзаўскім РК КП(б)Б вылучаны наступныя т. т.: Будзінскі («Зьвязда»)—зав. «Камунар», Красіна («Рабочий»)—зав. «Камунар», Танхілевіч (ЦК КП(б)Б)—зав. «Камунар», Васкабойнікаў (ВСНГБ)—ф-ка «Кастрычнік», Дунец («Акцябрь»)—ф-ка «Кастрычнік», Чарвякоў (ЦВК)—ф-ка «Кастрычнік», Грысевіч (ВСНГБ)—друк імя Сталіна, Уласаў (Дом камасьв.)—друк. імя Сталіна, Рычкоў (ЦП саюзу працасьв.)—друк. імя Сталіна, Заранбоўскі (ЦП саюзу працасьв.)—зав. «ДА», Лур'е (Камвуа)—зав. «ДА», Любін (Дом камасьв.)—ф-ка «Беларуска», Саевіч (Камвуа)—ф-ка «Камунарка», Тамашэвіч (Камвуа)—Эльвод, Сямёнаў (Камвуа)—Белдзяржбуд, Карачун («Зьвязда»)—Белдзяржбуд, Папоў («Зьвязда»)—Менбуд, Сяргеяў (газэт. бюро)—Менбуд, Спэктар (СНК)—Менбуд, Ляскоўскі (СНК)—ф-ка «8 саквіка», Дзянісаў («Чырв. Зьмена»)—зав. «Беларусь», Плятнёў (ЦП саюзу СТС)—зав. «Пралетары», Кабакоў («Акцябр»)—«Чырв. тэкстыльш.», Вержбаповіч («Зьвязда»)—шпалерн. ф-ка, Лунец (СНК)—скарняжн. ф-ка, Курлянд (БАН)—рымарн. ф-ка, Цудзін (ЦК МОПР'у)—працалектыў «Уціль», Орліс (Дом камасьв.)—гарКСТУ, Чарнецкі (БПТ)—Аўтакіраўніцтва, Алісевіч (БПТ)—Абкамтэст, Агульнік (БАН)—міліцыя, Рыжоў (ЦСПСБ)—хлебазавод, Кеніг (хлебозавод)—адда. хлебазаводу.

Савецкія яч. вылучаюць дакладчыкаў самастойна з сваіх ячэек.

ФРК КП(б)Б.

СЁНЬНЯ:

—БАН. У 18 гадз. у габ. марксызму 1 ленінізму—сэмінар асьпірантаў-літаратараў па дыялектыкту.

— Пэдгабінэт. У 19 гадз.—сход роты палітэхнізацыі школы.

ЗАЎТРА:

— Дом Камасьветы. У 10 гадз.—даклад т. Агульніка на тэму: «Аб прадпасылках, рухомых сілах і характары рэвалюцыі 1905 году». Білеты па райкомах і ў чытальні дому. У 19 гадз.—заняткі гуртка ангельскай мовы.

— Дом Пісьменьніка. У 19 гадз.—шырокі сход Менскай філіі БелАПП сумесна з членамі рабочых літгурткоў на прадпрыемствах. У парадку дня: Аб рабоце рабочых літгурткоў і перабудовы ўсёй работы БелАПП'у. На нараду запрашаюцца прадстаўнікі культсавецтаў усіх прадпрыемстваў г. Менску.

—МК БДУ даводзіць да ведама ўсіх пайшчыкаў - працаўнікоў БДУ, што апошнія дні перарэгістрацыі—20 і 21 сьнежня ў МК БДУ в 4 да 7 гадз. веч. Рэгістрацыя неабходна, як вучот для атрыманьня талёнаў на дэфіцытныя тавары.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная канторa Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	6-19	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	6-19	Галоўная кантора	7-31
Партсэктар	10-74	Аддзел падпіскі	7-31
Сэктар інфармацыі	12-80	„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Прафрук")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 19-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 2-гі паверх, тэл. 7-31.

1-я МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ КП(б)Б

адкрываецца **25 сьнежня** ў 6 гадз. веч. у Доме Камасьветы імя К. Маркса,

з наступным парадкам дня:

1) Чарговыя гаспадарча-палітычныя задачы партыі.

2) Выбары ўдарнага кварталу і задачы Менскай партэрганізацыі на 3-ці год пяцігодкі.

3) Выбары кіруючых органаў арганізацыі.

Выдача мандатаў праводзіцца па райкомах КП(б)Б: на Фрунзаўскім—т. Кажанам, на Кастрычніцкім—т. Мінцам у наступны час: 23 і 24 сьнежня з 10 гадз. ран. да 4 гадз. дня і з 6 да 9 гадз. веч.; 25 сьнежня ўвесь дзень да пачатку канферэнцыі.

Сьпіс дэлегатаў павінен быць паданы ячэйкамі ў РК не позьней 22 сьнежня.

Рэдакцыя газ. „Зьвязда" разам з рэдакцыяй газ. „Рабочий" склікаюць на 22 сьнежня ў 7 гадз. веч. у памяшк. Дому Камсамолу (Камсамольская, 25)

НАРАДУ МЕНСКІХ РАБКОРАЎ,

прысьвечаную **праверцы і агляду па выкананьні промфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўкі да 3-га году 5-годкі.**

Рэдакцыі газэт: «ЗЬВЯЗДА і «РАБОЧИЙ»

Сёньня 19 сьнежня ў 6 гадз. веч. ў памяшканьні клюбу металістаў (Універсітэцкая, 12) адбудзецца

СХОД ПРАФАКТЫВУ г. Менску

па пытаньні: **выніні лістападаўскага пленуму ЦСПСБ** (дакладчык старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў).

Уваход па білетах, якія атрымаць у ЦП саюзу і фабзаўкомах.

Члены ЦП саюзу і ЦСПСБ праходзяць на сваіх мандатах.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

СЁНЬНЯ, 19 сьнежня—паказ для ДПУ

У. Вішнеўскі.

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

прысьвечана Чырвонай арміі.

Пастаноўка У. Тазаўроўскага. Мастак Б. Матрунін. Музыка Стаславадзенскага. Фота для сьветавых дэкарацый І. Салавейчыка. Дырыжэр І. Фітгарц. Хормайстар М. Вуфман. Пам. рэж. Л. Буцько.

ПАЧАТАК роўна у 8 гадз. веч.

Клюб імя К. Маркса
САВЕЦКАЯ ФІЛЯРМОНІЯ

22 сьнежня

Адзіны канцэрт

МІКАЛАЯ ОСІПАВА

і Дзьмітрыя КАЙСАРАВА.

У праграме Шопэн, Ліст, Сэн-Санс, Васіленка і Прокофіеў.

„Калі слухаеш Міколая Осіпава, мімаволі ўзьнікае вобраз вялікага скрыпача-віртуоза і аганіні. Таксама, як Паганіні сілай свайго генія ўзмацніў скрыпічнае майстэрства ў яго сапраўдным дасканаласьці, так і Осіпаў выклікаў да жыцьця інструмент і зрабіў яго ў сваіх руках такім-жа ўдасканаленым, як і скрыпка.

Народны артыст рэспублікі М. Іпалітаў-Іваноў".

Білеты прадаюцца ў раб. тэатр. касе з 12—2 і 4—6, а ў дзень канцэрту ў клюбе К. Маркса з 6 г. веч. Па калектыўных заяўках—скідка 10 проц.

Пачатак—у 8 з пал. гадз. веч.

КІНО „Культура"

НОВЫ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
КАЛЮЧЫ ДРОТ драма ў 8 час.
Звыш праграмы
ЭКСТРАНЫ выпуск часоп. „Саюзкіно"
Суд на „прамапартыяй"
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м., і 10 г. 20 м.
КАСА—ад 5 гадз.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА
І. Чалавек застаўся адзін кіно драма ў 6 част.
Экстраны выпуск часопісі „Саюзкіно"
Суд над „прамапартыяй"
ІІ. Новы замежны гукавы фільм
ЛЕБЕДЫ ПЛАВАЮЦЬ
Каса адчыняецца з 5 гадз. веч.
Пачатак сэансу ў 6 з пал. гад.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

БЭСТЭР КІТОН
у замежным фільме
ГЕНЭРАЛ
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.
Каса—ад 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары"

Мастацкі фільм
За манастырскай сьцяной
У гал. ролі КІКА Л.І.
Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. веч.
Каса адкрыта ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „ЮНЫ ПІЯНЭР"

Гістарычны фільм
ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ
драма ў 10 частках.
Пачатак сэансу ў 1 г. дня і 3 г. дня
Каса—ад 12 гадз.

КІНО „ПартаК"

Выдатны фільм
КАЛЕСКІ РЭГІСТРАТАР
драма ў 7 частках.
У гал. ролі МАСКЕІН.
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 45 м.
Каса—ад 6 гадзін.

Уваравіцкому райсельбанку (м. Уваравічы БССР, 5 клм. ад ст. чыг., 40 хв. язды да Гомелю) ПАТРЭБНЫ:
Інспэктар-эканаміст з окладам 150 р. у м-ц.
1 бухгальтар (пам. ст. бухгальт.) — 120 р. у м-ц.
12 рахункаводы—75 р. у месяц.
Умовы пераезду, згодна арт. 82 КЗаП. Прапановы адрасаваць: м. Уваравічы, райсельбанк, або г. Менск Белкалгасбанк, аддзел кадраў.

СЁНЬНЯ, 19 сьнежня ў 6 гадз. веч.,
у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай)
АДБУДЗЕЦЦА
арганізаваная савецка-нямецкім т-вам «Навука і Тэхніка» сумесна з Будаб'яднаньнем
ЛЕКЦЫЯ праф. МАКСА-МАЕРА
НА ТЭМУ
„Рацыяналізацыя будаўніцтва".
Уваход дармовы па білетах, якія можна атрымаць у праектным бюро Будаб'яднаньня, Рэвалюцыйная, 3.
Будаб'яднаньне.

АДДЗЕЛ ПАДПІСНЫХ І ПЭРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАНЬНЯЎ
Белдзяржвыдавецтва
на 1931 год
АДКРЫТА ПАДПІСКА
на часопісь літаратуры, мастацтва і крытыкі
ЎЗВЫШША
ВЫДАНЬНЕ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.
Выходзіць 10 кніг у год.
„УЗВЫШША"—друкуе мастацкія творы шырока высьвятляе пытаньні паэзіі і вагул усіх галін мастацтва.
„УЗВЫШША"—жыва адклікаецца ў мастацкім слове на ўсе пытаньні палітычнага, літаратурнага і мастацкага жыцьця.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:	На 1 год	На 6 мес.	На 3 мес.	Асобны нумар
	6 руб.	3 р. 50 к.	2 р. 30 к.	80 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У аддзеле падпісных і пэрыядычных выданьняў БДВ. Менск, Савецкая, 79, усімі кнігарнямі, кіёскамі і ўпаўнаважанымі БДВ, ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і крамамі спажывецкай кааперацыі.

ДРУК КАЛЕКТЫЎНЫ АРГАНІЗАТАР МАС
ВЫВУЧАЙЦЕ І ЧЫТАЙЦЕ
ГАЗЭТЫ І ЧАСОПІСІ
ПАДПІСКУ НА 1931 Г. ЗДАВАЙЦЕ АРГАНІЗАТАРАМ ПАДПІСКІ. НА ПОШТУ І ГАЗЭТАНОСЦАМ
Здавайце падпіску да 27 числа кожнага месяца

ЦКК-НК РСІ Бел. прыступае да ПРАВЕРКІ і ЧЫСТКІ АПАРАТУ
Наркампрацы, Галоўсацстраху, інстытуту аховы працы і „Ўстаноўка" (б. ЦІП).
Просьба да ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і асоб, што маюць той ці іншы кампрамэтуючы матэрыял на работнікаў памянёных устаноў, а таксама матэрыял, які характарызуе недахопы ў рабоце апарату (выпадкі цыганіны, бюракратызму і г. д.), накіроўваць у ЦКК-НК РСІ, Савецкая, 55, пак. 10, цэнтральнай камісіі на чыстку.

Пярэсьпенская амбуляторыя паведамляе, што
ЗАПІС ДАКТАРОЎ НА ДОМ
—) праводзіцца в 8 да 10 гадз. раніцы. (—
Пасьля 10 гадз. запіс утвараецца на будзе.

КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ
21 сьнежня ў 9 гадз. веч.—
ДЫСПУТ
на тэму:
«Рэлігія, навука і навуковыя працаўнікі».
Для абмену думкамі запрошаны наступныя навукпрацаўнікі: Багданові, Бястужаў, Бурстын, Бурак, Вазабрынскі, Выдра, Вяршук, Громэр, Маўрыхіядзі, Мялкіх, Нікольскі, Панкевіч, Прыляжаеў, Розаноў, Сітэрман, Цітоў, Чарвакоў і інш.
Уступнае слова праф. С. Я. ВАЛЬФСОНА.
Уваход—вольны.

Мядыка-біялёгічная сэкцыя навуковай асацыяцыі.
20 сьнежня ў 7 гадз. 27 хв. вечера ў аўдыт. анатамічнага тэатру,—
чарговае пасяджэньне.
У парадку дня: 1) Даклад Бястужава «Аб умоўнасьці фэрмакалёгічнага дзеяньня». 2) Вертрын—Дэманстрацыя ват.-анат. прэпаратаў.

Калектыў супрацоўнікаў НК РСІ БССР выказвае сваё спачуваньне сям'і памёршага б. супрацоўніка РСІ
тав. ГЭРМАНА.

Катэдра палітэканоміі факультэту народнае гаспадаркі БДУ
20 сьнежня, ў 6 з пал. гадз. веч., у аўд. № 317,
ПРЫЗНАЧАЕ
ПАСЯДЖЭНЬНЕ
па пытаньні АБ БУРЖУАЗНЫХ УПЛЫВАХ НА РАБОТУ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ФАКУЛЬТЭТУ
Прысутнасьць навуковых працаўнікоў і студэнтаў факультэту абавязкова.

Матэматычна-фізычная асацыяцыя
наладжвае ў суботу, 20 сьнежня ў 5 г. веч. у фіз. аўд.
ДАКЛАД т. ЛАМЕІНА:
«Абцяканьне дасканалай і навыцісненай паверхні адвольнае колькасьці бясконцых паралельных цыліндраў»

Сёньня, 19 сьнежня, а 8 гадз. веч., у Пярэсьпенскай амбуляторыі (вул. Крапотніка, 114)
АДБУДЗЕЦЦА
агульны сход усіх застрахаваных,
якія абслугоўваюцца Пярэсьпенскай амбуляторыяй.
Парадак дня: 1) Справаздача гал. доктара. 2) Справаздача камісіі па ацэнцы амбулятор. маёмасьці.
Пасьля сходу—кіно)—(Яўка абавязкова.

Менскі Дзяржаўны хэміка-тэхналёгічны тэхнікум
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
зімовы набор адтэрмінован
І ЗАНЯТКІ 1-га СТУДЗЕНЯ НЕ ПАЧНУЦЦА.
Аб пачатку заняткаў будзе паведамлена праз друк дадаткова.
Дырэктар хэм.-тах. т-му Лаўчук.

САМАЯ ПАШЫРАНАЯ Ў СССР ІЛЮСТРАВАНАЯ ЧАСОПІСЬ
ОГОНЕК
ДАЕ СВАІМ ПАДПІСЧЫКАМ У 1931 г. ВЯЛІКУЮ ПАПУЛЯРНУЮ ГІСТАРЫЧНУЮ БІБЛІЯТЭКУ
24 КНІГІ
„ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ"
Выданьне выходзіць пад рэд. Г. ва Гістор.-Марксі. пры Камуністычн. Акадэм. ЦВК СССР і пад агульным кіраўніцтвам
М. Н. ПАКРОЎСКАГА.
Упершыню шматтомная папулярная бібліятэка „ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ", што выдаецца ў СССР, якая высьвятліць, асноўныя пытаньні сусьветнай гісторыі, прадстаўляе выключную вінавасьць для кожнага пісьменнага працоўнага, як каштоўная крыніца для самаадукацыі і цікавы, захапляючы матэрыял для чытаньня.
24 КНІГІ
„ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ" разьлічана на масавага чытача—парт., праф., камсамольсн., рабочых і калгасных актыў, вузаўцаў і як дапаможнік для парт. і праф. школ і курсаў.
Выданьне будзе багата ілюстрав. партрэтамі, гравюрамі, здымкамі з дакумэнтаў і факсімілэ. Гадавым падпісчыкам даркова: 2 вялікія мап. шматфарб. гістар. карціны.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА на „ОГОНЕК" з дадатк. „ВСЕМ. ИСТОРИЯ" і 2 шматфарб. карціны 21 р.
Допускаецца растэрміноўка: пры вапісцы—5 р.; на 1 сакавіка—4 р.; да 1 мая—5 р.; да 1 ліпеня—4 р. і да 1 верасьня—3 руб. „ОГОНЕК" без дадатку: на год —3 р. 25 к.; 6 м—1 р. 75 к.; 3 м.—0 к.
Падпіску здавайце выключна на пошту або лістаносцам.
Пераводы ў выдавецтва накіроўваць па трэба.
Ліц. изд. О-во „ОГОНЕК". Москва. Страстной бульвар, 11

ПУХАВІЦКАМУ РАЙСЕЛЬБАНКУ
ПАТРЭБНЫ: 1 бухгальтар, 1 эканаміст-плянавік.
Зарплата ня менш 150 руб.
Пісаць па адрасе: Пухавічы, Райсельбанк.

Усім бытавым і бытава-вытворчым камунам і калектывам.
Секцыя працы дзяржпляну просіць кіраўніцтва памянёных камун і калектываў
у 3-дзённы тэрмін
зарэгістравацца ў райгарпляне.
Дзяржплян.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ЗАЯЎ
на 3-месячныя КУРСЫ
па падрыхтоўцы рабочых на факультэт народнае гаспадаркі БДУ.
На курсы прымаюцца асобы з асьветай ня ніжэй 7-годкі.
Заявы прымаюцца да 25 сьнежня ў прафкоме наргасу з 6 гадз. веч., Універсітэцкі тарадок, гал. корп., 2-гі паверх.
ЗАНЯТКІ ПАЧНУЦЦА в 1 СТУДЗЕНЯ.

Касавая папулярная навукова-тэхнічная ілюстраваная часопісь
ИСКРЫ НАУКИ
(орган таварыства „Техника—массам")
у цікавай, захапляючай і самай зразумелай для радавога рабочага форме знаёміць сваіх чытачоў з навейшымі дасягненьнямі замежнай і савецкай тэхнікі, з асновамі фізыкі, хіміі, біялёгіі і інш. галін навукі.
Што такое электрычнасьць, як пабудована аэраплян, што атрымліваюць з нафты і г. д. і г. д.—аб усім гэтым можна даведацца, чытаючы часопісь «Искры Науки»
Выходзіць 2 разы ў месяц. Перадплаты ў выдавецтва пасылаць на трэба.
Падпіскайцеся на 1931 год да сьнежня 30 году на любыя тэрміны.
Падпісная плата:

12 мес.	— 5 р. 30 к.
12 мес.	— 4 р. 80 к.
6 мес.	— 2 р. 60 к.
3 мес.	— 1 р. 40 к.

Падпіску здавайце на пошту або лістаносцам, а таксама упаўнаважан. «Гудка» на транспарце.
З 25-га КАСТРЫЧНІКА